КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 23 (246) ◂ 10 чэрвеня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ЛЮДМІЛА АЛЯКСЕЕВА

Стар. 6

## ПЕРАХОД, ЯКІ ЗАЦЯГНУЎСЯ

Сутыкненні з рэальнасцю для тых, хто складае пра яе ўяўленне на падставе аналітычных нататак спецслужбаў, часта робяцца надзвычай балючымі

Стар. 4

## АПОШНІЯ ВЫБАРЫ ЖЫРЫНОЎСКАГА

Пра асаблівасці расійскай палітыкі журналісту «НЧ» Алегу Новікаву расказвае расійскі палітолаг Дзмітрый Касценка

Стар. 13

## СВАБОДА ВОЛЬГІ ІПАТАВАЙ

Стар. 14–15

ISSN 2218-2144

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**НАДЫШОЎ ЧАС ПАДПІСКІ НА ДРУГОЕ ПАЎГОДДЗЕ 2011 г.**

**НЕ ПРАПУСЦІЦЕ!**

З НАГОДЫ



# ПЕРШЫЯ ЗВАНОЧКІ

**Вольга ХВОІН**

**Падманутыя ў сваёй ілюзіі набліжэння да сярэдняга класу беларусы грукнулі ў дзверы стабільнасці пратэстам. Падобна на тое, што ненавісная рэжыму «пятая калона» павялічвае свае шэрагі.**

Наш інфармацыйны імклівы век складана ўтаймаваць. Нават КДБістам, нават у Беларусі. Пагрозу ў вынаходніцтве чалавецтва — інтэрнэце — улады краіны адчувалі нездарма. Варта было пахіснуцца мілай сэрцу валадароў «чырвонага дома» ідэі стабільнасці і квітнення, як на вуліцу з пратэстам выйшлі прадстаўнікі ўчорашняга электарату, а цяпер ужо апазіцыі. У Мінску і абласных гарадах прайшла акцыя пратэсту супраць падвышэння коштаў на бензін і дызельнае паліва «Стоп-бензін». У сталіцы акцыя мела і маштаб, і розгалас — аўтааматары на дзве з паловай гадзіны паралізавалі цэнтральны праспект. І дзеянні іх не мелі асуджэння — пешыя віталі «конных» воплескамі апладысментаў. І нават вадзіцелі і пасажыры тых машыны, што выпадкова трапілі ў паток, не абураліся, а націскалі на клаксоны, далучаючы свой голас да пратэстнага гулу. І сыпаліся на асфальт і з машын, і з натоўпу дробныя беларускія купюры — на знак іх абясцэньвання, што гэта ўжо не грошы, а фанцікі. І гучалі рэплікі: «Сёння стоп-бензін, заўтра — стоп-рэжым!», «Цікавей, чым на парадзе!», «Акупаваны горад вітае сваіх вызваліцеляў!».

Спыніць, разагнаць матарызаваную акцыю пратэсту сілавыя структуры, натрэніраваныя супраць мірных пешых дэманстрантаў, аказаліся бяссільныя. Міліцэйскія эвакуатары, што выехалі на праспект, міжволі аказваліся як бы ўдзельнікамі акцыі, мінакі віталі іх смехам.

Пакуль прэтэндэнты на розумы і сэрцы беларусаў з ліку апазіцыйных дзеячаў і палітыкаў будуюць планы на восень, незадаволеныя абывацелі самаарганізуюцца ў пратэстныя хвалі. І нервы не вытрымалі. На наступны дзень некалькіх удзельнікаў акцыі прысудзілі да штрафаў, хаця за такую правіннасць, як прысутнасць на плошчы Незалежнасці 19 снежня мінулага года, каралі турэмнымі тэрмінамі. Але не той суб'ект, каб яго дражніць. Наадварот, Аляксандр Лукашэнка тэрмінова ўчыніў традыцыйны разнос зарваўшымся чыноўнікам, загадаў панізіць кошты на паліва, а падвышэнне коштаў на іншыя тавары ўзгадняць непасрэдна з ім. Самы дарагі бензін цяпер мусіць каштаваць 4 500 рублёў за літр. Хто ведае, магчыма, акцыі «Стоп-бензін» наканавана стаць пачаткам «бензінавай рэвалюцыі».

Тым часам у сацыяльных сетках (праз якія ўласна і рассылаліся абвесткі наконт акцыі «Стоп-бензін») плодзяцца заклікі выходзіць на цэнтральныя плошчы гарадоў. Пакуль без сімволікі, плакатаў, лозунгаў. Але маштабы незадаволенасці ў народзе, які спрэс кляне ўладу за галечу, такія, што і да лозунгаў-патрабаванняў 19 снежня недалёка. Выходзяць пакуль што не тысячамі. У Мінску і абласных цэнтрах на цэнтральных плошчах сабраліся сотні. Ізноў жа па заклiку распаўсюджаных у сацыяльных сетках абвестках аб зборы людзей.

Сацыёлаг Аляксандр Сасноў зазначае, што незадаволенасць уладамі расце. І прагнозы ў гэтым кірунку для рэжыму негатыўныя. «Запалоханасць у грамадстве расце. Разам з тым у сакавіцкім апытанні рэйтынг улады ўжо ўпаў. Думаю, што пазнейшыя вынікі сацыялагічных даследаванняў пакажуць значны рост незадаволенасці палітыкай уладаў», — гаворыць эксперт.

Органы дзяржбяспекі паспрабавалі прыціснуць інтэрнэт-актыўнасць. Мадэратараў буйных беларускіх суполак сацыяльнай сеткі «ВКонтакте» наведалі КДБісты. Але ў стане сацыяльнай напружанасці на змену адным лідарам хутка прыходзяць новыя. Мэта такіх акцый — «пазбавіцца ад страху і пачаць дзейнічаць», «скінуць Лукашэнку». Да слова, моладзевая інтэрнэт-платформа «Рух будучыні», у групе якой «ВКонтакте» запісана больш за 211 000 чалавек, рыхтуе цыкл акцый «Рэвалюцыя праз сацыяльную сетку». З 8 чэрвеня па 1 верасня арганізатары прапануюць аднадумцам кожны тыдзень збірацца на галоўнай плошчы свайго горада.

Падзенне дыктатур Усходу, што адбылося цягам апошніх месяцаў, выявіла некалькі маркераў, што ўжо маюць месца і ў Беларусі: масавая незадаволенасць, новае пакаленне, што глядзіць на свет шырэй і не мае намеру жыць у дзяржаве-канваіры, аслабленасць улады па тых ці іншых пазіцыях. Да гэтага варта дадаць: каб атрымаць апошнюю інфармацыю «з палёў», цяпер не трэба чакаць выхаду газеты «Искра» — дастаткова зайсці ў сацыяльную сетку, дзе грамадзянская журналістыка шчодра выдае свежанькі прадукт.

Магчымае развіццё падзей залежыць хіба што ад часу і майстэрства ўладаў матэрыялізаваць грошы з паветра. Калі апошняе не ўдасца, колькасць гатовых пайсці на пратэст з лідарам ці без будзе толькі павялічвацца. І ўтаймаваць набрынялую за гады сілу злосці, незадаволенасці, прыгнечанасці чалавечага гонару атрымаецца хіба што злачынствам супраць свайго народа. Але, будзем спадзявацца, да гэтага не дойдзе.

КАМПАНІЯ

# FORD ПА-БЕЛАРУСКУ

Вольга ХВОІН

**Кампанія Ford будзе прасоўваць свае прадукты і сэрвісныя паслугі ў Беларусі па-беларуску.**

Тэмай першай рэкламнай кампаніі Ford на беларускай мове стане якасць абслугоўвання ў фірменным сэрвісным цэнтры. Беларуская мова будзе прысутнічаць не толькі ў рэкламных слоганах і на плакатах. Кампанія ўспрымае моўную канцэпцыю шырэй і дапускае выкарыстанне дзяржаўнай мовы Беларусі ў вусных зносінах з кліентамі салона або сэрвіснага цэнтра.

Выкарыстоўваць беларускую мову на прыярытэтнай аснове кампанія пакуль не гатовая, бо вялікая частка кліентаў выступае за падтрыманне двухмоўнай формулы, якая замацаваная ў Беларусі на дзяржаўным узроўні. Аднак новая камунікацыйная канцэпцыя нівелюе прыярытэт рускай мовы над беларускай, гарманізуе тым самым працэс зносін Ford са сваімі спажыўцамі ў Беларусі.

«Не так шмат кампаній выкарыстоўваюць беларускую мову для кантакту са спажыўцамі на тэрыторыі рэспублікі. Магчыма, таму, што ў краіне акрамя нацыянальнай існуе і актыўна выкарыстоўваецца руская мова, што для буйных міжнародных кампаній здаецца больш зручным для пабудовы рэкламных кампаній. Мы не вырашаем змяніць факт, які склаўся, або быць прыкладам для іншых кампаній. Наша задача — быць бліжэй да беларусаў, у тым ліку і за кошт выкарыстання двух дзяржаўных моваў: рускай і беларускай. Вельмі важна разумець, што рэклама ў нейкай ступені фармуе культурную і нацыянальную самасвядомасць, уплывае на моўныя працэсы, матывуе да выкарыстання канкрэтных моўных ведаў. Так што акрамя рэкламы мы закладваем у новую канцэпцыю яшчэ грамадскія, адукацыйныя функцыі», — адзначыў кіраўнік аддзела маркетынгу афіцыйнага імпарцёра Ford у Беларусі кампаніі «Атлант М Вест» Сяргей Скляраў.

Каб пашырыць і замацаваць практыку прымянення беларускай мовы, кампанія Ford плануе праводзіць у аўтацэнтры «Атлант М Баравая» Ford адмысловых «дзён беларускай мовы», у рамках якіх зносіны работнікаў цэнтра з кліентамі будзе будавацца з улікам прыярытэтнага выкарыстання нацыянальных лінгвістычных ведаў.

ПАДТРЫМКА

# ТОЛЬКІ НА ПАМПЕРСЫ

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Намеснік Міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Аляксандр Румак падчас анлайн-канферэнцыі «Асаблівасці арганізацыі працы жанчын і непаўнагадовых» паведаміў, што з кастрычніка памеры аднаразовай матэрыяльнай дапамогі з нагоды нараджэння дзіцяці падвысяцца ў два разы!**

З першага погляду, заява пазітыўная — нарэшце пачалі падвышацца не толькі кошты ў крамах. Праўда, пералічыўшы суму дапамогі на долары, становіцца ўражанне ад абяцання знікае — падвышэнне складае ўсяго $137. Трохі матэматыкі: на дадзены момант сума БМП раўняецца 343 тыс. 260 рублям, і невядома, ці будзе падвышацца да кастрычніка. Памер падтрымкі зараз складае 1 млн. 716 тыс. 300 рублёў, а ў кастрычніку будзе раўняцца 3 млн. 432 тыс. 600 рублям. У адпаведнасці з сучасным курсам Нацбанка Беларусі выходзіць $691 супраць ранейшай сумы ў $554 (пры курсе Нацбанка да дэвальвацыі).

Такім чынам, рэальнае падвышэнне памеру падтрымкі раўняецца 25%. Калі лічыць, канешне, не новыя надрукаваныя беларускія «зайчыкі», а набор рэчаў для немаўлят, які можна прыдбаць за гэтыя грошы. У адпаведнасці з сярэднімі коштамі ў папулярных інтэрнэт-крамах для немаўлят, сумы ў $137 хопіць роўна на 4 пакункі «памперсаў». Ды і тое, калі атрымаецца іх знайсці — на падгузнікі, якія збольшага ўвозяць з-за мяжы (роўна як і іншыя шматлікія рэчы для немаўлят) зараз вар'яцкі ажыятаж.

Калі ж палічыць, на што хапае ўсёй абяцанай сумы ў $691 пры ўмове, што кошты да кастрычніка не падвысяцца, дык пасля набыцця самай таннай каляскі, дзіцячага ложка (з матрацам), ванначкі і аўтакрэсла гаманец рэзка пусцее. А як жа харчаванне, вопратка, падгузнікі, цацкі — усё тое, што так неабходна для паўнавартаснага развіцця дзіцяці? На штомесяцовую падтрымку для дзіцяці да трох год у памеры 289 430 (зараз $58) асабліва не пашыкуеш.

Як нараджаць і выжываць у такіх умовах, Аляксандр Румак не патлумачыў, роўна, як і не сказаў, што рабіць жанчынам зараз, да кастрычніка, калі за адзін дзень падтрымка рэальна скарацілася з $554 да $346 і яе хапае роўна на 10 пачак «памперсаў».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# РЭПРЭСАВАНЫЯ «ДОБРЫЯ МЫСЛІ»

Аляксей ХАДЫКА

**31 мая за паўгадзіны да пачатку прэзентацыі кнігі вядомага філосафа Уладзіміра Мацкевіча «Не думайте о рыжем и слепом утконосе» гасцям фальварка «Добрыя мыслі» паведамілі: мерапрыемства адмяняецца. Як высветлілася, прычынай адмены стаў тэлефонны званок з адміністрацыі Маскоўскага раёна.**




1 чэрвеня мастацтвазнавец Таццяна Гаранская планавала адчыніць у «Добрых мыслях» выставу твораў жывапісу Міхася Рагалевіча (1932–2010) «Яблыня ў квецені». За паўгадзіны да адкрыцця адбылося тое самае, што і напярэдадні. Кіраўнічка ідэалагічнай і культурнай работы Маскоўскага выканкама нехта Таццяна Каліціна, вырашыўшы, што яна мае права распараджацца прыватнай кавярняй і планамі абсалютна непадпарадкаваных ёй людзей, забараніла мерапрыемства сваім тэлефонным званком. У выніку адбылася «закрытая» прэзентацыя, а выставу яе арганізатары дэмантавалі 6 чэрвеня. Такім чынам, рэпрэсаваны мастак Рагалевіч, які вырас у дзіцячым доме, таму што бацькоў сасланы, аказаўся рэпрэсаваным ідэалагіняй з маскоўскага выканкаму яшчэ раз. Кажуць, жонка мастака, якая спецыяльна прыехала на адкрыццё, ціха плакала ў кутку.

6 чэрвеня стала вядома, што «Добрыя мыслі» зачыняюцца. На дзвярах наведвальнікаў сустракала шыльда: «Не работаем. Вабцэ».

І тут варта паведаміць чытачу тое, пра што амаль ніхто не ведаў. Гаспадыня кавярні, Ірына Каліноўская, маючы іншы бізнес, падтрымлівала больш 10 гадоў фальварак як выключна актыўную выставачна-канцэртную пляцоўку. Якая прыносіла гаспадыні толькі страты. Гэта называецца — займацца дабрачыннасцю. За 10 гадоў, супрацоўнічаючы з Таццянай Гаранскай і Віктарам Маркаўцом, гаспадары здужалі арганізаваць у кавярні каля трох соцень выстаў. 2–3 выставы штомесяц. 10 гадоў таму, дарэчы, усё пачалося з экспазіцыі таго ж самага Рагалевіча. Зараз кола гісторыі «Добрых мысляў» сімвалічна замкнулася выставай яго ж работ. У прамежку былі паказы жывапісу, графікі, фатаграфіі.

Гаранская і Маркавец адчынялі забытыя імёны мастакоў Заходняй Беларусі. Калі ў мінулым годзе адбылася шырокая рэтраспектыва «Мастакі Заходняй Беларусі» у Нацыянальным мастацкім музеі, больш 50 працэнтаў паказаных на ёй работ былі творамі, якія прайшлі праз экспазіцыі ў «Добрых мыслях». А яшчэ былі паказы сотняў іншых таленавітых творцаў.

І да кожнай выставы — абавязковы каляровы буклет з тэкстам. І так 10 гадоў. Толькі на выставы (не лічачы канцэртаў) Ірына Каліноўская выдаткавала за гэты перыяд каля 150 тысяч долараў. А яшчэ яна купіла неабходную тэхніку для вядзення музейнай работы ў фальварку. Купляла работы ў мастакоў, асабліва імкнучыся падтрымаць небагатых творцаў. Яшчэ вынікам шматгадовай працы зрабілася падрыхтаваная да выдання серыя з 10 кніг: «Мастацтва Заходняй Беларусі», «Беларускае маладзёвае мастацтва», «Беларускае мастацтвазнаўства ў XX стагоддзі», «Беларускі маляваны дыван» (пад гэта выданне было арганізавана дзясятак пленэраў у Заслаў'і) і іншыя. Пэўна, зараз выхад гэтых кніг адкладаецца.

Ірына Каліноўская доўгі час маўчала і не казала нікому, як нахабная ідэалагіня разбурала яе бізнэс. Пасля прэзентацыі, прысвечанай стагоддзю «Нашай нівы», адбыўся першы наезд: у Каліноўскай забралі офіснае памяшканне на «АўтаВАЗе». Потым былі пастаянныя бязглуздыя праверкі ўсіх яе бізнэсаў і штрафы, штрафы, штрафы... І зараз — фінал.

У іншай краіне, амаль у кожнай краіне свету, такую асобу, як Каліноўская, якая ўкладае свае грошы ў падтрымку культуры, пэўна, узнагародзілі б галоўным дзяржаўным медалём. А частку грошай кампенсавалі б, панізіўшы ёй падаткі. У нас — не так. Ціхія героі ідэалагічнага фронту вядуць вайну супраць уласнага народа. Вы запомнілі гэта прозвішча — Таццяна Леанідаўна Каліціна? Мне здаецца, яго пакуль няма ў спісе чыноўнікаў, якім забаронены выезд у краіны ЕС. Хай адпачывае ў той самай краіне, атмасферу якой яна ўласнаручна атручвае.

НЕКРАЛОГ

# ПАМЯЦІ ФІЛОСАФА

**6 чэрвеня на 78-м годзе жыцця скончыў свой зямны шлях Уладзімір Міхайлавіч Конан. Ён змагаўся: пасля цяжкай аперацыі на нырках ён вытрываў яшчэ 6 гадоў. Ён змагаўся ўсё жыццё: і ў навуцы, і ў грамадзянскай дзейнасці — за праўду, за веды, за дабрыню.**



Пасля сталінскіх рэпрэсій беларуская гуманітарная школа была амаль цалкам знішчаная. Тым, хто сёння вельмі натуральна вывучае гісторыю беларускай філасофскай, эстэтычнай, літаратурнай думкі XVI–XX стагоддзяў па шматлікіх манаграфіях Уладзіміра Конана і па тысячах яго артыкулаў у энцыклапедычных даведніках, нават цяжка ўявіць, што гэтых крыніц не было.

Калісьці, калі ў 1962 годзе пасля 2 гадоў настаўніцкай працы на Вілейшчыне, малады Конан прыйшоў працаваць у Інстытут філасофіі і права АН Беларусі, нават дэклараваць тэмай сваіх навуковых пошукаў гісторыю беларускай культуры было няпроста. Гэта ж той самы час, калі Мікіта Хрушчоў, стоячы на прыступках Беларускага дзяржуніверсітэта прамовіў свае словы пра непазбежнае канание нацыянальных моваў у СССР. На шчасце, прыйдзісветы на кіраўнічых пасадах толькі маркуюць, што яны пануюць і распараджаюцца на ўсёй падуладнай ім зямлі.

Вельмі хораша днямі сказаў пра Конана Аляксандр Лукашук, дырэктар Беларускай службы Радыё «Свабода»: «Спакой і ўпэўненасць (Конана) грунтаваліся на гранітным падмурку ведаў і веры. Як і Васіль Быкаў, ён узвышаўся над сучаснасцю і задаваў ёй гістарычныя каардынаты». Ён і застаецца такім у памяці: узважаны, добразычлівы, трошкі ўсмешлівы, заўсёды гатовы выслухаць і дапамагчы. Колькі ёсць сіл. Здавалася, ён жыў на зямлі нетаропка і разважана, бы на нябесным Алімпе. Як філосаф на фрэсцы Рафаэля ў Ватыкане — «Афінская школа». Толькі гэта быў пачатак школы мінскай і беларускай. Хай жа справа Уладзіміра Конана множыцца ў працах яго вучняў і паслядоўнікаў.

Рэдакцыя «НЧ»

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЦЭНЫ — НАЗАД!

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў знізіць цэны на паліва. Такое распараджэнне ён зрабіў 8 чэрвеня на экстраннай нарадзе па актуальных пытаннях эканомікі, фрагменты якой былі паказаны па дзяржаўных тэлеканалах.**

«Давайце дамовімся: паліва з заўтрашняй раніцы будзе не 5 тысяч 200 — 5 тысяч 100, а максімум 4 тысячы 500 рублёў, — сказаў Лукашэнка. — Таму можаце ісці і абвясціць усім: 4 тысячы 500 — гэта максімум, гэта я бяру самы дарагі бензін. Ад гэтага будзем лічыць і дызельнае паліва, і больш танны бензін, нізкаактанавы».

Паводле яго слоў, у далейшым цана на бензін не будзе ўзрастаць рэзка, а будзе прывязана да курсу долара, які ўстановіцца.

«І да 1 студзеня, калі ў нас будзе курс ці то 5.000, ці то 4.500: калі 4.500 — такім і застанецца, калі 5.000 — значыць, да 1 студзеня будзеце працаваць па цэнаўтварэнні, у квартал дадаючы па 2–3%, калі гэта трэба будзе. Але не на 30%. Вось і ўсё маё рашэнне адносна паліва», — падкрэсліў Лукашэнка.

Ён дадаў, што, магчыма, давядзецца «адкручваць цэны» і па іншых групах тавараў.

Не, сапраўды мы вярнуліся ў «ліхія 1990-я». Таму што менавіта годзе ў 1995-м Лукашэнка запатрабаваў «адвярнуць» цэны на галоўныя прадукты харчавання, кшталту хлеба, пасля іх падвышэння. Нічога не змянілася ў Беларусі.

Больш за тое. Зараз Аляксандр Рыгоравіч забараніў любое павышэнне цэн у краіне больш як на 5% без яго ведама.

«Я катэгарычна забараняю любы рух звыш 3–5% па цэнах без майго ведама», — заявіў Лукашэнка на нарадзе 8 чэрвеня. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ад урада растлумачыць, чым матываваны рэзкі рост цэн. «Галоўная праблема, якая дагэтуль хвалюе людзей, — гэта інфляцыя. Галоўнае ж сёння — трэба не проста зрабіць так, каб бюджэт у нас быў тоўстым і тлустым, а абараніць людзей. Пры гэтым абсалютна недапушчальны рост цэн»,— паведаміў ён.

І што? З 8 чэрвеня рознічныя цэны на тытунёвыя вырабы павышаюцца ад 10 да 60%. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Міністэрства эканомікі №86 ад 6 чэрвеня 2011 года, апублікаванай на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. У распаўсюджаным 7 чэрвеня каментары Мінэканомікі адзначаецца, што рашэнне аб павышэнні рознічных цэн прынята «ў сувязі са зменай сітуацыі на валютным рынку па прапанове канцэрна «Белдзяржхарчпрам», ТАА «Тытунь-інвест», РВГУП «Беларусьгандаль» і іншых зацікаўленых». «Прыняцце гэтага рашэння абумоўлена найперш ростам курсу асноўных замежных валют у дачыненні да беларускага рубля, што ўлічваецца пры фармаванні цэн на тытунёвыя вырабы, а таксама ў мэтах выканання плана мерапрыемстваў па барацьбе з тытунекурэннем у адпаведнасці з палажэннем Рамачнай канвенцыі САЗ, прадухілення несанкцыянаванага вывазу тытунёвай прадукцыі за межы рэспублікі», — адзначылі ў Мінэканоміі.

З 28 мая рознічныя цэны на гарэлку павышаныя на 10%.

Гранічныя максімальныя адпускныя цэны на свініну патушную ў чэрвені павялічваюцца на 10%. Як пракаментавалі ў Мінэканоміі, «у сувязі з ростам сусветных цэн на найважнейшыя сыравінныя рэсурсы і ўвязным імпартным бялковым дабаўкі для вытворчасці камбікармоў, зменай сітуацыі на валютным рынку сельгасвытворцамі былі павялічаны закупныя цэны на свінняў».

Папярэдняе павышэнне было ў маі — на 8%.

У Беларусі неабходна забяспечыць сацыяльную абарону грамадзян і не дапусціць скачкападобнага росту цэн, заявіў Аляксандр Лукашэнка 8 чэрвеня на нарадзе па актуальных пытаннях эканомікі.

«Галоўная праблема, якая дагэтуль хвалюе людзей, гэта інфляцыя. Мной было дадзена ўказанне прэм'ер-міністру, губернатарам і мэру Мінска самым жорсткім чынам рэагаваць на рост цэн. Я быў упэўнены, што гэтыя службовыя асобы будуць прымаць рашэнні ўзважана і абдумана, бо галоўнае сёння не проста зрабіць так, каб бюджэт быў «тоўстым і тлустым», а галоўнае — абараніць людзей», — сказаў Лукашэнка.

«Пры гэтым абсалютна недапушчальна, — я аб гэтым катэгарычна папярэдзіў, — рабіць рэзкія рухі ў цэнаўтварэнні. Можна толькі ўніз, уверх нельга. І тады я сказаў, што мяне нават лібералы крытыкаваць не будуць, таму што цэны ўперліся ў столь, далей ім расці няма куды. Усе з гэтым згадзіліся», — падкрэсліў ён. На думку Лукашэнкі, калі дзесьці патрэбна была карэкціроўка цэн, то гэта неабходна было рабіць плаўна і акуратна, «людзі павінны былі мець магчымасць прывыкнуць да любога руху».

«Людзі толькі-толькі ачухаліся ад удару — на табе, як абухом па галаве, другі раз. Толькі людзі прыйшлі ў сябе — на табе трэці раз, і гэта, мяне інфармуюць, не апошні, — сказаў Лукашэнка. — Тады, хлопцы, я скажу вам, не ў краіне, а дзесьці за межамі трэба будзе шукаць працу. Я дапусціць гэтага здзеку з людзей не магу. Я вас папярэдзіў 10 дзён таму, прэм'ер-міністра асабіста».

А тым часам прадпрымальнікі рынку «Малінаўка» маюць намер правесці 15 чэрвеня забастоўку супраць ліквідацыі гандлёвых месцаў.

Вечарам 8 чэрвеня на Кастрычніцкай плошчы Мінска прайшла акцыя маўклівай салідарнасці, на якую сабраліся актывісты групы «ВКонтакте» «Рэвалюцыя праз сацыяльную сетку» і тыя, хто адгукнуўся на іх ініцыятыву.

Прыхільнікі «рэвалюцыі праз сацыяльную сетку» заклікалі ўсіх ахвотных прыйсці на цэнтральную плошчу Мінска — без сімволікі, транспарантаў і іншых мітынговых атрыбутаў. На іх заклік да 19.00 на плошчы сабралася каля сотні маладых людзей. Праз паўгадзіны іх налічвалася ўжо каля чатырохсот. Прысутныя хаатычна перамяшчаліся, некаторыя — на веласіпедах, віталі знаёмых, размаўлялі, жартавалі, многія размясціліся на прыступках ганка Палаца Рэспублікі. Потым сярод іх з'явіўся мужчына з гітарай, які праспяваў некалькі песень — апошнія акорды патанулі ў апладысментах. Моладзь, якая ўтварыла пасярод плошчы вялікі круг, падхапіла песенную ініцыятыву, зацягнуўшы «Тры чарапахі» гурта N.R.M.

Добрая «Дзяржава для народа» атрымліваецца?



Photo.ByMedia.Net

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ІРЫНА ВЕШТАРД



Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) правяла паўторны XIII з'езд, на якім быў абраны новы кіраўнік партыі — Ірына Вештард. За яе прагаласавалі 77 чалавек пры адным голасе «супраць», сямёра ўстрымаліся. Вештард пры абранні заявіла, што мае намер захоўваць адзінства партыі, не перашкаджаць яе дзейнасці, «як гэта рабіў былы старшыня партыі Анатоль Ляўковіч». Яна таксама сказала, што, калі не апраўдае надзей сябраў партыі, «без сумнення пакіне сваю пасаду». З'езд таксама ўнёс карэктывы ў статут партыі, каб падаць дакументы ў Мінюст. Ірына Вештард доўгі час узначальвала Гродзенскую абласную арганізацыю сацыял-дэмакратаў. На мінулых парламенцкіх выбарах Ірыну знялі з гонкі, абгрунтаваўшы гэта тым, што быццам бы частка подпісаў за яе вылучэнне была несапраўднай.

На папярэднім з'ездзе БСДП (Грамада), які адбыўся 10 кастрычніка 2010 года, кіраўніком партыі замест Анатоля Ляўковіча быў абраны Анатоль Сідарэвіч. Аднак Мінюст прызнаў вынікі з'езду, у тым ліку тыя, што тычацца абрання кіраўніцтва, несапраўднымі ў сувязі з парушэннямі заканадаўства падчас яго падрыхтоўкі.

У студзені 2011 года Мінюст вынес БСДП (Грамада) два пісьмовыя папярэджанні ў сувязі з адсутнасцю дзейнасці для арганізацыі паўторнага з'езду.

### РАМАН БЯССМЕРТНЫ



Экс-пасол Украіны ў Беларусі Раман Бяссмертны не беларус па паходжанню, але яго прынцыповая пазіцыя адносна сітуацыі ў краіне яго ўжо былой дыпламатычнай місіі вартая ўвагі. З чэрвеня прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч сваім указам вызваліў Рамана Бяссмертнага ад абавязкаў пасла ў Рэспубліцы Беларусь. Некалькімі днямі раней Бяссмертны выказаў рэзкую крытыку ў дачыненні да афіцыйнага Мінску. Бяссмертны быў прызначаны паслом у Беларусі папярэднім украінскім прэзідэнтам Віктарам Ючанкам.

«Для сусветнай супольнасці відавочна: калі вы не хочаце адстойваць еўрапейскія каштоўнасці ў Беларусі — значыць, вы самі гатовыя іх парушаць. І ніякія эканамічныя выгады недапушчальна абменьваць на гэтыя каштоўнасці», — цытуе Бяссмертнага агенцтва УНІАН. — Дарэчы, я не ўяўляю, як мог бы Віктар Януковіч стаць прэзідэнтам, калі б ягоны папярэднік Віктар Ючшанка дзейнічаў у дачыненні да апанентаў гэтак, як дзейнічае прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка», — сказаў экс-пасол.

Раман Бяссмертны распавёў, што за яго жорсткія выказванні на адрас беларускіх уладаў палітыкі, якую яны праводзяць, яго неаднаразова запрашалі ў Міністэрства замежных спраў Беларусі і, як і іншым паслам, рабілі заўвагі.

Адстаўны пасол таксама паведаміў, што Украіна падрыхтавала праграму па «навядзенню мастоў» паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам. «Яна прагаворвалася на сустрэчы міністраў замежных спраў абедзвюх дзяржаў, але, на жаль, мне не вядомая рэакцыя ўладаў Беларусі, — зазначыў Раман Бяссмертны. — Што тычыцца дыпламатыі, канчатковага рашэння я яшчэ не прыняў. Але мой гадавы дыпламатычны вопыт сведчыць: да шчасця або на жаль, я не ўмею хаваць свае эмоцыі за словамі. Хутчэй за ўсё, гэта занятак — для іншых людзей. Магчыма, вярнуся ў палітыку».

### МАКСІМ МІРНЫ

33-гадовы беларускі тэнісіст Максім Мірны ўзняўся з шостага на трэцяе месца ў парным рэйтынгу АТП пасля перамогі на адкрытым чэмпіянаце Францыі. Гэта найвышэйшы рэйтынг спартсмена пасля 23 ліпеня 2007 года, — піша БелаПАН.

Мірны быў лепшым парным тэнісістам свету з 9 чэрвеня па 7 верасня 2003 года, з 20 кастрычніка 2003 года па 1 лютага 2004 года і з 29 студзеня па 15 красавіка 2007 года.

Яго партнёр па пары Дэніэл Нестар (Канада) перамясціўся з трэцяга на чацвёртае месца. Летась Нестар таксама выйграў «Ралан Гарос» (з сербам Ненадам Зімонджычам), таму цяпер проста абараніў балы. Мірны год таму выбыў у 1/16 фіналу (гуляў з індыйцам Махешам Бхупаці), таму цяперашняя перамога дадала яму 1,910 балаў.

Вікторыя Азаранка апусцілася з чацвёртага на пяты радок у рэйтынгу WTA, саступіўшы месца пераможцы «Ралан Гарос» На Лі. Кітаянцы Азаранка прайграла ў чвэрцьфінале.



АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ПЕРАХОД, ЯКІ ЗАЦЯГНУЎСЯ

Сяргей НІКАЛЮК

**Сутыкненні з рэальнасцю для тых, хто складае пра яе ўяўленне на падставе аналітычных нататак спецслужбаў, часта робяцца надзвычай балючымі.**




Аднойчы я паглядзеў па тэлевізары заканчэнне фільма (назву, на жаль, не памятаю) з Сямёнам Фарадай у галоўнай ролі. Яго герой размаўляў выключна газетнымі штампамі эпохі развітога сацыялізму. А зараз прапаную чытачам «НЧ» уявіць звычайны мінскі аўтобус, які ў самы час пік накіроўваецца з Малінаўкі ў цэнтр горада. І раптам прыстойна апрануты мужчына, які стаіць побач з вамі, добра пастаўленым голасам прамаўляе: *«Согласно Конституции, основой политической системы нашей страны является президентская власть как гарантия стабильности и успешной реализации любых преобразований. Это главная особенность белорусской модели развития страны в переходный период. И она еще сегодня сохраняет свою актуальность»*.

Уявілі? Не, не мужчыну, а рэакцыю пасажыраў на *«особенность белорусской модели развития страны в переходный период»*.

## Прамежкавы варыянт блуканняў

Паводле афіцыйнага погляду на беларускую рэальнасць, мы ўжо 17 гадоў знаходзімся ў працэсе пераходу. На натуральнае пытанне: «А дзе мы апынёмся пасля яго завяршэння?» існуе адназначны адказ: «У Еўропе!» Мяркуеце самі: *«Нас не надо уговаривать идти в Европу. Мы в ней находимся. И никогда не стремились отгородиться от тех ценностей, от всего хорошего и прогрессивного, что наработано в западноевропейских государствах, в Евросоюзе. Более того, мы вполне разделяем те демократические идеи, которыми руководствуются эти страны. Многие из этих ценностей исторически наработаны и нашим народом, на нашей территории»*.

Пераход беларусаў з Еўропы ў Еўропу не варта разглядаць у якасці хуткаплыннай падзеі. Тут напрошваецца аналогія са знакамітым блуканнем габрэйскага народа па пустыні пад кіраўніцтвам Майсея. Яно працягвалася сорак гадоў. Чаму так доўга? Таму што Майсей быў бы авантурыстам, *«если бы, пренебрегая традициями, менталитетом наших людей, привычным укладом жизни, который сложился за всю нашу предыдущую историю»*, спрабаваў у тэмпе вальса (на раз-два-тры) перанесці *«западный образец устройства общества на нашу почву»*.

З гэтым не паспрачаешся. Да моманту распаду СССР па ўзроўні канцэнтрацыі «чалавека савецкага» Беларусь упэўнена займала першае месца сярод савецкіх рэспублік. Мне ўжо неаднаразова даводзілася спасылацца на апытанне ВЦИОМ, праведзенае ў сакавіку 1991 года. Толькі 24% этнічных беларусаў ідэнтыфікавалі сябе ў якасці грамадзян БССР, а 69% — у якасці грамадзян Савецкага Саюза. Для параўнання: у Эстоніі суадносіны былі 97 да 3. Праз 15 гадоў, у красавіку 2006-га, на пытанне «Ці лічыце Вы сябе хутчэй сучасным еўрапейскім чалавекам ці савецкім чалавекам?» другі варыянт адказу абралі 52% рэспандэнтаў, аднеслі сябе да еўрапейцаў крыху больш за трацціну — 36% (тут і далей дадзеныя НІСЭПД).

Такім невясёлым стаўся прамежкавы вынік блуканняў пад кіраўніцтвам айчыннага Майсея. Пераход з Еўропы ў Еўропу відавочна зацягнуўся. Новай Беларусі пакуль не атрымалася. У якасці каментара прывяду словы галоўнага знаўцы «чалавека савецкага» сацыёлага Юрыя Левады: «Крыху асцярожней я б казаў «новая краіна». Назва новая. Краіны без чалавека не бывае. Калі людзі застаюцца старымі, калі сацыяльныя інстытуты застаюцца старымі, калі звычкі эліты і масы застаюцца ў вялікай ступені старымі, то з агаворкамі можна казаць пра тое, новая ці не новая краіна. Куды чалавек можа ўцячы з гэтых рамак?»

## На дыванку паміж крэсламі

Магчымасці палітычнай эліты непасрэдна фармаваць «новага чалавека» вельмі абмежаваныя, але яна здольная змяніць рамкі, у якіх чалавек фармуецца. Для далейшага руху па прыступках азбукавых паліталагічных ісцін нам спатрэбіцца чарговае ключавое слова. У дадзеным выпадку найбольш пасаваць будзе слова «ўзнаўленне».

Традыцыйным (архаічным) цывілізацыям уласціва панаванне статычнага ўзнаўлення, г. зн. накіраванага на падтрыманне грамадства, культуры і асобы ў адпаведнасці з некаторымі ідэалізаванымі ўяўленнямі пра мінулае. У сучасных (ліберальных) цывілізацыях пануючае становішча займае інтэнсіўнае ўзнаўленне, якое характарызуецца імкненнем да пастаяннага падвышэння эфектыўнасці.

Трагедыя Беларусі палягае ў тым, што яна даўно ўжо выйшла за рамкі традыцыйнай цывілізацыі, але пераступіць мяжу цывілізацыі ліберальнай так і не здолела. Яна затрымалася на памежжы. Але краіны, як адзначаў Левада, без чалавека не бывае. На мяжы паміж дзвюма цывілізацыямі затрымаліся беларусы. Варта паскрэбці практычна любога, як без вялікіх цяжкасцяў мы заўважым пласты «чалавека традыцыйнага» ў яго савецкім і нават дасавецкім варыянце.

Нявызначанасць цывілізацыйнага выбару спараджае запатрабаванасць у адмысловым шляху. Сацыёлагі любяць задаваць рэспандэнтам пытанне наконт іх геапалітычных пераваг. Калі варыянты адказаў абмежаваць Расіяй і Еўрасаюзам, то, у залежнасці ад бягучай палітычнай кан'юнктуры, атрымліваецца прыблізна роўнае размеркаванне. Але калі да традыцыйнай салодкай геапалітычнай парачкі дадаць «уласны адмысловы шлях», то апошні апынецца па-за канкурэнцыяй.

Прывяду адказы на пытанне «Які, на Ваш погляд, гістарычны шлях Беларусі?» за снежань 2009 года: «Уласны адмысловы шлях» — 55,0%, «Агульны шлях еўрапейскай цывілізацыі» — 23,6%, «Вяртанне на савецкі шлях» — 20,7% і не здолелі адказаць — 0,7%. Звярніце ўвагу на мізэрную колькасць тых, у каго ўзніклі цяжкасці з адказам. У тым жа снежні пры адказе на пытанне «Калі б давялося выбіраць паміж аб'яднаннем з Расіяй і ўступленнем у Еўрапейскі Саюз, што б Вы абралі?» не здолелі вызначыцца 15,7% рэспандэнтаў (у 22,5 разы больш!).

Імкненне адначасова ўладкавацца адразу на двух цывілізацыйных крэслах па-чалавечы зразумелае, аднак, улічваючы значную дыстанцыю паміж крэсламі, на практыцы мы маем сталыя самаразбуральныя канфлікты, якія неаднаразова прыводзілі да абвалу дзяржаўнасці. Гэта калі ўлада *«валяется в грязи»*. Апошні раз такое здарылася напачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя.

Адсюль імкненне абрацца *«иной путь своего развития — эволюционный, без резких скачков и перегибов»*. Гучыць добра, але з «развіццём» неяк не вельмі стасуецца. Развіццё не варта блытаць з эканамічным ростам. Развіццё — гэта рост плюс іcтытуцыянальныя і сацыяльныя змены. У працэсе развіцця фармуецца «новы чалавек», здольны абыходзіцца без дзяржаўнай апекі. Такі чалавек уяўляе смяротную пагрозу для палітычнай эліты, якая ўладкавалася на дыванку паміж двума цывілізацыйнымі крэсламі.

Таму рамкі, у якіх сёння «ўзнаўляюцца» беларусы, па сваіх параметрах істотна не адрозніваюцца ад рамак сямнаццацігадовай даўніны. Колькасць залежных ад дзяржавы беларусаў не скарачаецца. Ці варта пасля гэтага дзівіцца стабільнасці электаральнай структуры грамадства?

## Варыяцыі на тэму «новай эры»

*«Белорусы — это те же русские, только со знаком качества»*. Такі лубочны малюнак склаўся ў галовах тых, хто доўгія гады глядзеў на беларусаў з вяршыні ўладнай «вертыкалі». Майскі таварны ажыятаж, які спустошыў паліцы крамаў, прымусіў сяго-таго перагледзець правы беларусаў насіць такі высокі знак адрознення. Нечакана высветлілася, што *«нас воспринимают вообще как дикарей»*.

Якая сувязь паміж пустымі паліцамі і дзікунамі, асабіста мне зразумець складана. Ва ўсім свеце, сутыкнуўшыся з эканамічнай нявызначанасцю, людзі дзейнічаюць аднолькава. Нездарма яшчэ гуру фінансавых рынкаў Джордж Сорас адзначаў, што «інвестары паводзяць сябе як бараны». Заўважу, што ў большасці інвестараў, паводзіны якіх меў магчымасць назіраць Сорас, за плячыма быў калі не Гарвард, то, прынамсі, Прынстан.

«Чалавек эканамічны», г. зн. чалавек, які думае катэгорыямі асабістых прыбыткаў і страт, баязлівы па вызначэнні. Як адзначыў у сваёй кнізе «Ірацыянальнае багацце» амерыканскі эканаміст Роберт Шылер: «Усе значныя бумы на фондавых рынках звычайна суправаджаюцца гісторыямі пра новую эру, што прэтэндуюць на апісанне гістарычных змен, якія стануць пачаткам новага гістарычнага этапу». У Беларусі фондавы рынак калі і існуе, то выключна намінальна. На жыццё шараговых грамадзян ён ніякага ўплыву не аказвае, але вось штó да гісторый пра новую эру, то ўжо амаль 17 гадоў беларусы прачынаюцца і засынаюць пад іх бясконцыя варыяцыі.

Такія гісторыі і фармуюць статкі даверлівых бараноў-інвестараў. Амерыканцы інвестуюць у акцыі, беларусы — у банкаўскія дэпазіты. Розніца непрынцыповая, падабенства робіцца асабліва прыкметным падчас лопання інвестыцыйных бурбалак, раздзьмутых не без дапамогі гісторый пра новую эру.

Сутыкненні з рэальнасцю для тых, хто складае ўяўленне пра яе на падставе аналітычных нататак спецслужбаў, часта робяцца вельмі балючымі. У гісторыі зафіксаваны і фатальныя выпадкі, калі «той, хто сутыкнуўся» быў не ў стане да канца ўсвядоміць змены, што адбыліся. Апошні прыклад — зараз ужо былы прэзідэнт Егіпта Хосні Мубарак. За некалькі гадзін да заканчэння свайго трыццацігадовага знаходжання на пасадзе прэзідэнта ён выступаў у прамым тэлеэфіры і прамаўляў так, як быццам ён паранейшаму з'яўляецца улюбёнцам егіпецкага народа.

Але не будзем пра сумнае. Заканчваць «Азбуку паліталогіі» варта калі і не на аптымістычнай, то, прынамсі, на вясёлай ноце. Для гэтага я прапаную чытачам вярнуцца ва ўяўны аўтобус, які курсуе па маршруце Малінаўка–4 — Дружная. Нам пашанцавала. Прыстойна апрануты мужчына з добра пастаўленым голасам яшчэ не выдаткаваў свой запал прамоўцы. Прывяду яго заключную рэпліку-цытату: *«Сегодня мы переходим к новому этапу строительства нашего государства, который характеризуется либерализацией экономики и более интенсивным развитием предпринимательства. При этом надо понимать, что повысить предприимчивость, инициативу, экономическую активность граждан невозможно без адекватного повышения их роли в формировании решений по социально-экономическим проблемам общества»*.

МЕРКАВАННЕ

# НІ ВУДЫ, НІ РЫБЫ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ



**Урад Беларусі абнародаваў план антыкрызісных захадаў з мэтай «забеспячэння» збалансаванага развіцця эканомікі ва ўмовах змянення афіцыйнага курсу беларускага рубля». То бок ніякіх табе рынкавых сацыялізмаў або капіталізмаў без дробнага ды буйнога прадпрымальніцтва.**

Ніякага табе постіндустрыяльнага грамадства, у якое Беларусь павінна была, згодна з адной праграмай, трапіць літаральна гэтымі днямі, а дабрабыт працаўнікоў дасягнуць недзе 50–70% ад сярэднееўрапейскага ўзроўню. Не, пра «планов громадье» стараюцца не ўзгадваць. А ўсяго толькі пра курс беларускага рубля.

Але ж і ў такой малой справе без хітрыкаў не абыходзіцца. Бо само вызначэнне мэты правакуе чытача да высновы, што раней, пры былым курсе, эканоміка развівалася збалансавана. Гэта значыць, прыбыткі былі нашмат большыя за выдаткі, а баланс знешняга гандлю краіны быў стабільна дадатны і экспарту экспарт нашмат пераўзыходзіла вартасць імпарту. Таму прадпрыемствы, фірмы, бюджэты розных узроўняў не ведалі, куды грошы дзець, як распарадзіцца валютнымі рэсурсамі, каб яшчэ болей зарабіць для сябе і для краіны.

Дык вось. Нічога такога і блізка не было. Некалькі гадоў запар велічыня адмоўнага сальда павялічвалася. За выключэннем студзеня, кожны месяц бягучага года павялічваў адмоўнае сальда знешняга гандлю болей, чым на мільярд долараў. За I квартал мінулага года памер адмоўнага сальда ў гандлі таварамі склаў 1,2 мільярда долараў, за першыя тры месяцы бягучага года больш 3 мільярдаў. Адмоўнае сальда ў цэлым за мінулы год склала 9,6 мільярдаў. Кожны вучань можа падзяліць адно на другое, памножыць і атрымаць вынік — у бягучым годзе Беларусь «недабярэ» ад знешняга гандлю ад 24 да 30 мільярдаў долараў.

Грошы не тое каб вялікія, можа сказаць, шалёныя. Калі гэта збалансаванае развіццё, то, мусіць, не ў бухгалтарскім разуменні гэтага слова. Бо пры такіх лічбах галоўныя бухгалтары ці страляюцца, ці іх садзяць у турму.

Увогуле, цяжка зразумець, на што разлічваў Лукашэнка, калі патрабаваў ад прадпрыемстваў павялічваць вытворчасць валавой прадукцыі, ад продажу якой на знешніх рынках нельга нават «адбіць» выдаткі. Кожны школьнік, якога павінны навучыць азбуцы эканомікі (сёлетні ж год абвешчаны Годам прадпрымальніцтва), будзе ведаць, што гэта тупіковы шлях. І, магчыма, спытаецца ў настаўніцы: хто завёў Беларусь у тупік?

А яшчэ ж існуе нікім да гэтага часу не абвергнуты закон захавання рэчыва і энергіі. Нічога з неадкуль не бярэцца, нічога нікуды не знікае. Толькі пераўтвараецца адпаведна са сваёй прыродай. Калі галава на плячах не толькі для фуражкі, то яна падказвае, што можна рабіць, а што нельга ні ў якім выпадку. Ад якой працы будзе плён, а ад якой марнатраўства. Галава падкажа, як разумнае зрабіць дзейсным.

Увогуле, толькі дзейнасць, якая прыносіць чалавеку і грамадству большыя набыткі за выдаткі, якая дае чалавеку годныя заробкі, можа лічыцца працай. А калі чалавеку праз тры дні пасля палучкі — хоць міласціну збірай, то гэта не праца. Гэта здзек з чалавека, гэта марнатраўства эканамічных рэсурсаў, якіх заўсёды не хапае. Нават краінам, вельмі багатым на рэсурсы.

З такой вось нагоды ў большасці краін забаронена дзейнасць прадпрымальнікаў-марнатраўцаў. Рынкавай канкурэнцыяй, прафесійнымі саюзамі ды ўрадамі, якія сочаць, каб прадпрымальнікі бесперашкодна атрымоўвалі прыбыткі, а працоўныя — заробкі.

У нас жа ні заробкаў, ні прыбыткаў. Калі б справа дайшла да суду (незалежнага і таму аб'ектыўнага), фірму «Беларусь» давялося б збанкрутаваць, галоўнага менеджэра звольніць ды наняць антыкрызіснага ўпраўляючага.

Беларусы жалю не вартыя, бо занадта многа і доўга слухалі прыемныя для сябе ад Менеджэра рэчы, і яму адказвалі такімі ж прыемнасцямі. Хай новы кіроўца не шкадуе беларусаў, нават не любіць іх. Але хай навучыць, прывучыць краіну, створыць такую эканамічную сістэму, у якой можна працаваць ды зарабляць грошы. Менавіта краіну. У такой краіне плённа працуецца кожнаму паасобку і ў складзе карпарацыі. Усё ведаюць, што такое добрая працоўная мараль, і чаму нельга заліваць вочы на рабоце без усялякіх дырэктыў.

Зразумела, грошы ў эканоміцы выконваюць найважнейшую ролю. Але значна больш важна ўменне іх зарабляць. Настолькі, наколькі ўменне рабіць вуду важней за ўменне лавіць рыбу. Ёсць вуда — некалі нешта клюне нават на новы кручок. А ў нас атрымліваецца — ні вуды, ні рыбы. Бегаем па беразе, галёкаем, хто б выручыў. Клянемся, што ў апошні раз. А далей ужо самі заробім. Як? Вы не паверыце! Для дасягнення балансу антыкрызісная праграма ўрада прадугледжвае (пункт 32) павялічэнне аб'ёму экспарту за кошт падвышэння аб'ёмаў вытворчасці.

Ведаеце, гэта нават не смешна. Бо галоўнай крыніцай дысбалансу з'яўляюцца прамежкавыя тавары, якія Беларусь купляе для вырабу гатовай прадукцыі. Гэта сыравіна, энерганосьбіты, камплектуючыя. Прычым сыравіну, энерганосьбіты можна лёгка прадаваць на сусветных рынках, а пры адпаведнай кан'юнктуры, прадаваць выгадна і вельмі выгадна. Гатовую ж прадукцыю — не заўсёды. Возьмем, напрыклад, тыя ж цыгарэты. Паколькі Беларусь не мае уласнага тытуню, то яна купляе яго ў замежжы. Па цэнах, усталяваных канкурэнцыяй пакупнікоў. А вось гатовыя цыгарэты з беларускім брэндам можна прадаваць на адносна абмежаваных рынках і па тых коштах, якія яны прапануюць.

Каб патаргавацца, то не надта патаргуешся. У любы момант скажуць, што за такія грошы мы возьмем «натуральную фірму».

Цікава і тое, што Расія (ЕврАзЭС), якая быццам бы патрабавала ад Беларусі змены прыярытэтаў для пераадолення сістэмнага крызісу эканомікі, на такую бязглуздзіцу нават не звярнула ўвагі. Пачала працэдуру выдачы чарговага крэдыту. Але не пад абстрактныя і сумнеўныя абяцанкі, а пад абяцанне рэальна ўдзелу расійскага капіталу ў прыватызацыі цікавых для яго беларускіх актываў.

Вось такі баланс інтарэсаў.

РОЗДУМ

# КРАІНА СПІВАЕЦЦА

Юры ХАДЫКА, прафесар

**Трапіў неяк на расійскім тэлеканале на перадачу «Агульная справа» і застаўся да яе канца. Гаворка ішла аб п'янстве.**

Былі розныя прамоўцы. Адны заклікалі прыняць закон, які абмяжуе ўжыванне алкаголю. Другія пярэчылі, пагражаючы самагонам і ўжываннем спіртаўтрымліваючых тэхнічных вадкасцей. Трэція аналізавалі прыклад заходніх краін, дзе п'юць, але ведаюць меру. Святар заклікаў звярнуцца да Бога. Быў гарадскі вар'ят з прыкметамі алкагалізму на твары, які распавёў, як п'юць у асяродку мастакоў. Гучалі заклікі адкрыць ЛТП па прыкладу СССР і Беларусі і пачаць прымусова лячыць аматараў «зялёнага змея». Нехта прыгадаў і славутае выслоўе вялікага князя кіеўскага Уладзіміра пра весялосць на Русі.

Але не праходзіла і не прайшло адчуванне безнадзейнасці. На свядомасць давілі лічбы, што прагучалі, — 18 літраў чыстага алкаголю на душу насельніцтва РФ. Гэта ў два разы больш той мяжы, за якой пачынаецца выраджэнне генафонду. А калі ўлічыць, што прыкладна траціна насельніцтва ў Расіі мусульмане, якія не п'юць ці п'юць мала, то лічбы робяцца яшчэ больш жахлівымі.

У Беларусі сітуацыя крыху лепшая. Але не нашмат — каля 11 літраў улічанага алкаголю на сённяшні дзень і тэндэнцыя далейшага росту. Мая цешча, добры дзіцячы доктар, адзначала рост прыроджаных хвароб у немаўлят яшчэ 30 гадоў таму, калі алкаголь ужываўся ў памеры каля 8 літраў на душу. Сёння прыкметы алкагалізацыі грамадства навідавоку. Раніцою збіраюць бутэлькі і рыюцца ў сметніцах ужо не бабулькі, а мужыкі сярэдняга веку. Вечарам на прыгожых лавах уздоўж вуліцы Якуба Коласа студэнты без палавых адрозненняў распіваюць піва «з гарла». Я спрабаваў тлумачыць хлопцам у тралейбусе, што піць піва, як есці, мыцца, адпраўляць малую і вялікую патрэбы, неабходна ў спецыяльна адведзеных месцах. Гэта — норма культуры. Глядзяць як на дзівака. Ім ніхто такога не казаў. Часам спыняюць смактаць піва, а часам моўчкі працягваюць.

Алкаголь — гэта наркотык. І як наркотык ён выклікае прывыканне. Пры раптоўным спыненні яго ўжывання назіраецца нешта накшталт ломкі. Трэба прыняць порцыю алкаголеўтрымліваючай вадкасці, каб спыніць пакуты. Алкаголь паралізуе волю і павольна, але няўхільна вядзе чалавека да смерці. Співаліся і сыходзілі з гістарычнай арэны цэлыя плямёны і народы. Каланізатары эфектыўна выкарыстоўвалі спірт разам са зброяй для «асваення» Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, Аўстраліі і Сібіры. Зараз пагроза выраджэння навісла над Расіяй і Беларуссю.



Навукоўцы вызначаюць прычыны трох кшталтаў, якія вядуць да алкагольнай залежнасці. Генетыка, фізіялогія і сацыяльныя ўмовы. Генетыка — поле для навукі. Фізіялогія — для дактароў. Сацыяльныя ўмовы — наша агульная справа. Справа, што залежыць найперш ад улады, якую мы выбіраем.

Я не люблю імператара Мікалая Другога (празванага Крывавым). Але адну справу ён зрабіў добра. З пачаткам Першай сусветнай вайны ва ўмовах выбуху шавінізму ён увёў сухі закон — цвярозыя войскі ішлі вызваляць Царград ад туркаў і вучыць германцаў. І да кастрычніка 1917-га салдаты паміралі на франтах не п'яныя. Не было перад атакай сталінскіх ста грамаў. Затое з часоў Другой сусветнай вайны ўжыванне алкаголю ўвесь час расло. І дайшло да таго, што алкаголь стаў адной з галоўных крыніц напаўнення бюджэту. Народ трапіў у заганнае кола. Грошы, сабраныя ад продажу спіртнога, ішлі на лячэнне ад алкагалізму і на пенсіі. Аднак сярэдняя працяглацсь жыцця паніжалася, пакуль для мужчын не стала ніжэй за пенсійны ўзрост. Кропка. Далей рухацца няма куды.

Зразумела, што трэба лячыць, трэба мець ЛТП, трэба падвышаць узрост для вольнага продажу спіртнога. Трэба будаваць спарткомплексы і бегаць кросы. Трэба падвышаць якасць і кошт напояў. У кляты савецкі час за сярэдні заробак можна было набыць 30–40 бутэлек гарэлкі, а зараз — больш за 150! Мора разліванае. Рай для турыстаў з Фінляндыі. Толькі ўсе пералічаныя меры лекуюць сімптомы хваробы, а не яе прычыну. Пра прычыну гавораць няўцямна, быццам саромеючыся. Цяжкасці жыцця. Стрэсы. Але і гэта — другаснае.

Скажам проста і адназначна — бязвер'е і адсутнасць свабоды. Панаванне начальнікаў-халуёў і бессаромных «ідэолагаў». Панаванне хлусні і гвалту. Акіяна хлусні, у якім патанае краіна. Адсутнасць выбару як прэзідэнта, так і мясцовай улады. І ніводнага слова пратэсту з боку царкваў, што ўсходняга, што заходняга падпарадкавання. Ніводнай малітвы за вызваленне вязняў, кінутых за краты беззаконна. Быццам не Хрыстос ахвяраваў сваім жыццём за нашы правы. Таму здольныя і працалюбівыя людзі пакідаюць краіну. Астатнія співаюцца. Калі не вераць у Бога і не змагаюцца за свабоду.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# Людміла Аляксеева: ПОСПЕХ НАШАЙ БЕЗНАДЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

Вольга ХВОІН

**Яна не баялася турмы і лагераў за савецкім часам, не баіцца ўлады, міліцыі цяпер. Але геваічным чалавекам жывая легенда праваабарончага руху Людміла Аляксеева сябе не лічыць. Называе сябе баязлівай — ёсць фобіі вышыні і глыбіні. З гумарам расказвае пра пагрозы арышту і вымушаную эміграцыю ў часы СССР. «Я — першакрыніца. Першакрыніца ў жывым выглядзе... У яшчэ жывым выглядзе», — жартуе Людміла Міхайлаўна падчас сустрэчы ў Мінскім офісе Беларускага Хельсінскага камітэту.**



Фота аўтара

Людміла Аляксеева

Візіт у Беларусь Людмілы Аляксеевай, старшыні Маскоўскай Хельсінскай групы — гэта праява салідарнасці з праваабаронцамі, з тымі, хто пацярпеў ад рэпрэсій цяперашняй улады за сваё іншадумства.

У маленькім пакойчыку офісу Беларускага Хельсінскага камітэту, дзе і адбывалася сустрэча, задушна, цесна. І ціха. Атмасфера ўвагі да мужнасці гэтай маленькай і крохкай жанчыны ў гадах.

— Днём нараджэння праваабарончага руху я прапанавала лічыць 5 снежня 1965 года, калі на Пушкінскай плошчы прайшоў першы ў краіне мітынг з патрабаваннем выконваць Канстытуцыю. Мітынг быў пад лозунгам «Паважайце савецкую канстытуцыю!» Яшчэ адзін лозунг — «Патрабуем галоснага суда над пісьменнікамі Андрэем Сіняўскім і Юліем Даніэлем!». Яны друкаваліся пад псеўданімамі на Захадзе. Ведалі, што гэта пагражае ім карамі, але кожны чытач хоча мець пісьменнікаў, а пісьменнік — чытачоў.

Потым я прачытвала гэтыя кнігі і нічога надта антысавецкага не пабачыла. Яны пачалі публікавацца ў 1956-м, а доблесныя чэкісты раскрылі толькі праз 9 год. Хаця дзве-тры сотні чалавек у Маскве добра ведалі, хто хаваецца за гэтымі імёнамі. Канспіратары мы былі яшчэ тыя, а калі больш дакладна, то ніякія, — пачынае экскурс у гісторыю праваабарончага руху краін былога СССР Людміла Міхайлаўна пасля знаёмства з моладзевай аўдыторыяй.

— І ў сталінскія часы былі выпадкі, калі людзі заступаліся на судзе за абвінавачваемых. Рабілася гэта ці па вялікай наіўнасці і неразуменню, чым гэта пагражае, ці з маральнага абавязку, — тлумачыць акалічнасці 45-гадовай даўніны дэмаршу савецкіх грамадзян. — Улады не заўважылі, што за 12 гадоў пасля смерці Сталіна настрої ў грамадстве змяніліся. Людзі падпісваліся пад зваротамі з патрабаваннем патлумачыць, за што былі арыштаваныя пісьменнікі, называлі сваё імя, адрас.

Патрабавалі свабоды слова. Гэта першае грамадзянскае права, якое запатрабавалі савецкія людзі. Права пісьменнікам пісаць, а чытачам — чытаць. Чалавек 20 выйшла. У асноўным студэнты, бо грамадзянскі зварот набралі на друкарцы і раскінулі па гуманітарных інстытутах. Але намнога больш было людзей, і я ў тым ліку, якія спачувалі, — узгадвае слынная праваабаронца.

Яна зазначае, што спецслужбісты і міліцыянты адразу ж схапілі дэманстрантаў незапланаванай уладамі вулічнай акцыі. Аднак вымушаныя былі адпусціць людзей, бо не ведалі, у чым пакараць тых, хто хоча павагі да савецкай Канстытуцыі. Дарэчы, адкрытага суда тады дамагліся. Але гэта не зашкодзіла адправіць пісьменнікаў у лагеры.

Ужо з іх лістоў стала зразумела, што ў краіне ёсць лагеры для «палітычных» з адпаведнай кампаніяй асуджаных, — пісалі, як «літоўскі святар запрашаў на гарбату, а забаўны ўкраінец намаляваў цудоўны партрэт». Людміла Міхайлаўна падкрэслівае, што свабода сходаў гарантавалася савецкай Канстытуцыяй. Аднак адна з заснавальніц праваабарончага руху іранічна заўважае, што «існаваў добры жарт: Канстытуцыя гарантуе свабоду сходаў, але ніхто не ведае, ці гарантуецца свабода пасля». І дадае: «Мы ўсе адзін аднаго ведалі. Гэта была не праваабарончая супольнасць, а садружнасць. Канешне, гуртавала і адчуванне небяспекі».

На Пушкінскую плошчу Людміла Міхайлаўна выходзіла з мірнымі акцыямі пратэсту і ў наш час. А 31 снежня 2010 года яе нават завезлі ў Цвярское аддзяленне міліцыі Масквы — акурат туды забіралі ў 1965 годзе ўдзельнікаў снежаньскай вулічнай акцыі.

На пытанне аб моладзі Беларусі, якая з'язджае, бо не бачыць тут будучыні, Людміла Міхайлаўна пакідае рэмарку: «Я магу вас парадаваць — з Расіі таксама з'язджаюць». І крыху распавядае пра ўласную эміграцыю з Савецкага Саюза, якая выявілася не такой безнадзейнай і катастрафічнай, як тое падавалася:

— Калі я з'язджала, то ўжо была не моладзь (Людміле Міхайлаўне было на той момант 50 год. У студзені 1977 года, пасляператрусаў на кватэры Аляксеевай, канфіскавалі самвыдат і замежную праваабарончую літаратуру. У адмысловай заяве ТАСС яе разам са старшынёй МХГ Юрыем Арловым і пісьменнікам Аляксандрам Гінзбургам абвясцілі агентамі антысавецкага Народна-працоўнага саюза — В. Х.). Эміграцыя — не спосаб барацьбы, але чалавек мае на гэта права. Як гаворыць старая прымаўка, рыба шукае, дзе больш глыбока, а чалавек — дзе яму лепш. Так заўжды было і будзе. Ніхто не мае права прымушаць чалавека жыць там, дзе ён не хоча з тых ці іншых прычын. Я з'ехала не таму, што хацела ці ратавалася ад арышту, хаця гэта фактычна быў мой паратунак ад лагераў.

Я з'ехала ў 1977 годзе, большасць маіх сяброў на той момант ці ўжо адседзелі, ці яшчэ сядзелі. І як справядліва заўважыў адзін мой прыяцель, калі вашы знаёмыя праводзяць адпачынак у Парыжы, то вам падаецца, што гэта нармальна. А калі вашы знаёмыя сядзяць па лагерах і турмах, то вам падаецца, што не будзе нічога незвычайнага, калі і вы там апынецеся.

Мне так і падавалася — падумаеш, лагер, ну, адсяджу пяць-сем гадоў, я здаровая, працаваць змагу. Калі пасля не дазволяць жыць у Маскве — Расія вялікая, знойдзецца месца. А за мяжой — мовы не ведаю, дыпломы не прызнаюць. Кім я там буду? І галоўнае — тады эміграцыя была назаўсёды, цяпер, канешне, можна з'ехаць і вярнуцца, як не спадабаецца. І вось я думала: лагер жа на пяць-сем год, а эміграцыя — назаўсёды. Гэтае страшнае слова «назаўсёды». Але мой муж адседзеў у сталінскія часы пяць гадоў па палітычным артыкуле і бясконца цвердзіў з веданнем справы, што лагер — не месца для жанчыны, — спакойна распавядае Людміла Міхайлаўна, і прызнаецца, што баялася зусім не зняволення.

— Да гэтага я спакойна ставілася. Іншая справа, што калі б я трапіла ў лагер, то сапсавала б жыццё блізкім. Мужа б выгналі з працы, і ён быў бы вымушаны вазіць мне перадачы, невядома дзе зарабляючы на іх грошы. Сыну з-за мяне не далі паступіць у аспірантуру. І да ўсяго мае родныя не проста ведалі пра маю дзейнасць. Аднойчы была магчымасць з Грузіі прывезці сто асобнікаў падпольна надрукаванай кнігі «Архіпелаг Гулаг» Салжаніцына. Я б сама не змагла яе забраць, дык папрасіла сына і мужа, каб яны прыйшлі і дапамаглі. І вось калі б нас тады злавілі, то сын і муж маглі б сесці толькі за тое, што любяць сваю маці і жонку, што не дазваляюць ёй насіць цяжкія торбы. Разуменне, што я сапсую жыццё блізкім, паўплывала на маё рашэнне. У выніку я выдатна вывучыла англійскую мову, напісала кнігу, пачала выступаць па радыё.

У эміграцыі Людміла Аляксеева напісала кнігу «Гісторыя іншадумства ў СССР». «Майму мужу Мікалаю Вільямсу — без яго гэтая кніга не была б напісана», — гаворыцца ў эпіграфе да «першай спробы сістэматызаванага апісання сучаснага іншадумства ў Савецкім Саюзе».

У 1993 годзе Мікалай Вільямс і Людміла Аляксеева вярнуліся ў Расію. «Без перабольшвання я магу сказаць, што ад таго часу і да гэтага моманту ёсць найбольш шчаслівы, асэнсаваны перыяд майго жыцця, — прамаўляе Людміла Міхайлаўна, і ў выразе твару з'яўляецца няўлоўны водблеск супакаення — так гавораць пра шчаслівае пражытае і дарагое. — Я не пісьменнік, я арганізатар па натуры. Мне падабаецца працаваць, выцягваць людзей з тых пераплётаў, куды яны трапляюць. А кнігу я напісала ў эміграцыі, бо чым там яшчэ займацца?»

Спадарыня Аляксеева з гумарам глядзіць на крутыя віражы свайго лёсу і папярэджвае, што ўзрост — не нагода для страхаў: «На маё 75-годдзе я сказала гасцям — толькі адна жанчына была аднаго са мной узросту, астатнія маладзейшыя, — каб не баяліся старасці, бо самае цікавае ў іх наперадзе. Калі людзі выходзяць на пенсію, то ў большасці з іх шлях паміж аптэкаю і домам, ну і да крамы бывае. А я вось, бачыце, да вас прыехала...»

Характар Аляксеевай спалучае прынцыповасць і гуманізм. «Я ўвогуле мірны чалавек, а ў 83 гады мая мірнасць вырасла да незвычайных памераў, — іранізуе спадарыня Людміла. І гаворыць, што калі справа тычыцца жыцця чалавека, якое ёсць першаснай каштоўнасцю, усе сродкі добрыя. «Чалавечае жыццё найбольш важнае. Трэба выцягваць з турмаў, а ўжо потым займацца рэабілітацыяй, — выказвае сваю пазіцыю наконт таго, як дамагчыся вызвалення беларускіх палітвязняў кіраўніца Маскоўскай Хельсінскай групы. — Калі Захад зможа ў гэтым дапамагчы, трэба сказаць «дзякуй». У 1979 годзе прэзідэнт ЗША Картэр дамовіўся — і з савецкіх лагераў вызвалілі 5 палітычных вязняў, у тым ліку і сябра Маскоўскай Хельсінскай групы Аляксандра Гінзбурга. У снежні 1986 года Савецкі Саюз, як і зараз Лукашэнка, быў у вельмі цяжкім эканамічным становішчы. Яму важная была падтрымка Захаду. І пад ціскам Захаду цягам 1987 года 3 тысячы чалавек былі вызваленыя».

«Але найперш вызваліць гэтых людзей маглі б самі грамадзяне краіны, калі б было масавае патрабаванне. Шчыра, я думаю, што патрабаванне знізу будзе ўзрастаць. І людзі, якім далі такія вялікія тэрміны, іх цалкам не адбудуць. На жаль, у вас пакуль няма масавасці. Гэта з'яўляецца з цягам часу. Мубарак таксама 40 гадоў сядзеў, толькі пасля гэтага з'явілася масавасць. Ваш Лукашэнка яшчэ не сядзіць 40 гадоў... Але зараз гісторыя рухаецца хутчэй. Глядзіш — і вам не спатрэбіцца чакаць яшчэ 23 гады. Раней усё адбудзецца», — настройвае беларусаў на аптымістычны лад легендарная праваабаронца.

Людміла Міхайлаўна за Савецкім часам была паспяховым чалавекам, мела адукацыю, працу, сям'ю. Бацькі гадавалі ў ёй дух савецкага чалавека, які мусіць быць удзячны дзяржаве за набыткі свайго жыцця. Дык што прывяло фактычна ў апазіцыю да ўладаў?

— Проста брыдка стала ўдзельнічаць у ілжы, якая прапітала ўсю краіну. Я дарослы чалавек, і сама вырашаю, што мне чытаць, як жыць, з кім сябраваць. І дзядзькі-цёткі, якія гэта навязваюць, не выклікаюць у мяне ні павагі, ні жадання іх пераймаць. Калі я нарадзілася ў гэтай краіне ў гэты час, то я пражыву так, каб мне не было сорамна за сябе ні перад кім. Я пражыву гэтае жыццё, як вырашыла сама. Нічога палітычнага. Гэта быў маральны рух супраць ілжы, прыніжэння чалавека. У нас быў тост: вып'ем за поспех нашай безнадзейнай справы. Прайшло 45 гадоў — і вынікі ўсё ж заўважныя. Урэшце я веру, што кожны чалавек напрыканцы свайго жыцця мусіць не шкадаваць аб тым, як ён жыў. І не думаць, што яго жыццё было толькі для таго, каб нечага нахапаць, — рэзюмуе жывая легенда свайго часу, жанчына, на якую нават прадстаўнікі цяперашняга цынічна-іранічнага пакалення глядзяць з пачцівасцю.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 13 ЧЭРВЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**08.30** Дак. серыял «Гараджане».
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.05** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.10** Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях» (Францыя).
**14.15** OFF STAGE LIFE.
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дак.-біяграфічны цыкл «Мая праўда».
**16.30** «Выпадковыя сувязі». Гумарыстычная праграма.
**17.10** Серыял «Маршрут лёгасці» (Расія).
**18.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 01.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама».
**21.40** «Камандзіроўка».
**21.55** «Рэвальвер». Трылер (Вялікабрытанія-Францыя).
**00.05** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.55** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**01.30** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Удзел». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.05** Прэм'ера. Фільм «Пры загадкавых абставінах».
**00.10** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.00** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінушчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Мінушчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Прэм'ера! Фільм «На гапліку». Расія.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Прэм'ера! СТБ прадстаўляе: «Таямніцы нараджэння энергіі».
**23.30** «Сталічны футбол».
**00.00** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

### ЛАД

**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Пра мастацтва.
**09.35** «Навіны надвор'я».
**10.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**11.10** Прыгодніцкі фільм «Гаспадар мораў: на краі зямлі» (ЗША).
**13.30** Конкурс-вікторына «Дзеці новага пакалення».
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.20** Моладзевая камедыя «Вышэйшы баль» (ЗША-Германія).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.25** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** Бітва экстрасэнсаў.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Фільм «Зваротны шлях». 2010 г.
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Пакой смеху».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Фільм «Дажывём да панядзелку».
**12.55** Фільм «Залатая міна».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «Залатая міна». Працяг.
**16.00** Фільм «Тры паўграцыі».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Фільм «Тры паўграцыі». Працяг.
**18.25** Тэлесерыял «Сваты-3».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.35** Тэлесерыял «Сваты-3». Працяг.
**23.00** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Навагоднія сваты».

### НТВ

**06.45** «Рускія сенсацыі».
**07.35** «Праграма Максімум».
**08.35** «Кулінарны паядынак».
**09.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Таямнічая Расія. Галоўныя таямніцы». Адмысловы праект.
**19.00** Сёння.
**19.30** Баявік «Бой з ценем».
**22.55** Крымінальны баявік «Адшукваецца герой».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45, 15.45** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Францыя.
**10.45** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Фінал.
**12.00** Веласпорт. Францыя. 8-ы этап.
**13.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Жанчыны. Італія. Фінал.
**14.30** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года. Тулон (Францыя). Фінал.
**16.45** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Фінал.
**18.00** Веласпорт. Францыя. 8-ы этап.
**19.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Жанчыны. Італія. Фінал.
**20.25, 01.25** Навіны.
**20.30** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года. Тулон (Францыя). Фінал.
**21.45** Вось дык так!!!.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Веласпорт. Францыя. 8-ы этап.
**00.30** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года. Тулон (Францыя). Фінал.
**01.30** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Францыя.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**07.40** «Час гонару», серыял: 33 серыя.
**08.25** Чаму дэмакратыя? 2 серыя: «У пошуках рэвалюцыі».
**09.15** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**09.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.10** Без рэтушы: «Каліф на гадзіну», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**10.35** МакраФон: «Канцэрт гурта «N.R.M.»: ч. 1.
**11.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Выкупленне з Шаўшанку», маст. фільм, 1994 г., ЗША.
**14.20** «Час гонару», серыял: 33 серыя.
**15.10** Чаму дэмакратыя? 2 серыя: «У пошуках рэвалюцыі».
**16.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**16.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял: 8 серыя.
**17.30** «Час гонару», серыял: 33 серыя.
**18.15** Чаму дэмакратыя? 2 серыя: «У пошуках рэвалюцыі».
**19.10** Побач з намі.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Вагон.
**20.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.40** «Выкупленне з Шаўшанку», маст. фільм, 1994 г., ЗША.
**23.55** Аб'ектыў.

## 14 ЧЭРВЕНЯ, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.15, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут лёгасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** «Камандзіроўка».
**12.10** «Фота маёй дзяўчыны». Камедыйная меладрама (Расія).
**13.50** «Ведай нашых: беларускія палярнікі».
**14.00** «Здароўе».
**14.25** «Культурныя людзі». Інфармацыйна-забаўляльная праграма.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага».
**16.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**17.05** Серыял «Маршрут лёгасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 00.40** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Данія-Беларусь. Прамая трансляцыя.
**23.50** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.40** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 19.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Удзел». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчасліві разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Серафіма Цудоўная». Шматсерыйны фільм.
**22.05** Фільм «Клетка для трусаў».
**23.45** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.15** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінушчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «На гапліку». Расія, 2011 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Граф Монтэ-Крыста». ЗША - Вялікабрытанія - Ірландыя, 2002 г.
**16.00** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Мінушчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 2». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

### ЛАД

**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Рэальны свет.
**09.35** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**10.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**11.10** Моладзевая камедыя «Вышэйшы баль» (ЗША-Германія).
**12.55** «Страсці па культуры».
**13.35** Пазакласная гадзіна.
**13.50** Школьная камедыя «Прыгоды Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя» (СССР). 1-я серыя.
**15.00** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**16.00** Медычныя таямніцы.
**16.35** Медычныя таямніцы +.
**16.50** Бітва экстрасэнсаў.
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Швейцарыя - Ісландыя. Прамая трансляцыя.
**20.55** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.05** Калыханка.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.40** «Час футболу. Чэмпіянат Еўропы U-21».
**00.20** Бітва экстрасэнсаў.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Пакой смеху».
**10.10** «Хто Вы, містэр Рыд?». Дак. фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.50** Фільм «Чакайце лістоў».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**22.25** Тэлесерыял «Правілы згону».
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі.ru».
**23.55** Прэм'ера. «Урок Перальмана». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.30** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.25** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Лютасць».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Увага: вышук!».
**00.15** «Школа зласлоўя». Ток-шоў.

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!.
**09.45** Веласпорт. 8-ы этап.
**11.00** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Фінал.
**12.30** Вось дык так!!!.
**13.30** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). Дзень 2-і.
**17.00** Тэніс. Турнір АТР. Істборн (Вялікабрытанія). Дзень 2-і.
**21.10** Навіны.
**21.15** Вось дык так!!!.
**22.00** Бокс. Міжнародны паядынак.
**00.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Францыя.
**00.55** Навіны.
**01.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Сан-Марына. Заезд 1-ы.
**01.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Сан-Марына. Заезд 2-і.
**02.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Сан-Марына.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.40** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял: 8 серыя.
**08.05** «Лепей быць прыгожай і багатай», камедыя, 1993 г., Польшча.
**09.45** Еўропа сёння.
**10.10** Побач з намі.
**10.30** «Ранча», серыял: 7 серыя.
**11.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.30** Эксперт.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Без рэтушы: «Каліф на гадзіну», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**12.30** МакраФон: «Канцэрт гурта «N.R.M.»: ч. 2.
**13.30** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял: 8 серыя.
**13.55** «Лепей быць прыгожай і багатай», камедыя, 1993 г., Польшча.
**15.35** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**15.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**15.55** Еўропа сёння.
**16.25** Побач з намі.
**16.40** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял: 9 серыя.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 41 серыя.
**18.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «У дзень кірмашу», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**20.10** Праект «Будучыня».
**20.40** Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** Невядомая Беларусь: «Рок назаўжды–2», дак. фільм.
**22.10** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 10 серыя.
**22.55** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ 8

## 15 ЧЭРВЕНЯ, СЕРАДА

**1**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў».
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Відэафільм АТН «Спрадвечная талака» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** «Жыццё на дваіх». Дэтэктыўная меладрама (Расія-Украіна).
**13.35** «Вечары на сялібе блізу Дзіканькі». Невядомая версія». Дак. фільм (Украіна).
**14.30** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага».
**16.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 00.40** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Украіна-Англія. Прамая трансляцыя.
**23.50** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.50** Дзень спорту.

**Н**

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Участак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Серафіма Цудоўная». Шматсерыйны фільм.
**22.05** Фільм «Агора».
**00.15** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Начныя навіны.

**СТВ**

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мiншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Дaішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла 2». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Мiншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Дaішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 2». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

**ЛАД**

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** «Рэальны свет».
**09.40** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**10.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**11.15** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.00** Дача здароўя.
**12.35** Дакументальны фільм «Дзень TV».
**13.30** Пазакласная гадзіна.
**13.45** Школьная камедыя «Прыгоды Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя» (СССР). 2-я серыя.
**14.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.00** Медычныя таямніцы.
**16.35** Медычныя таямніцы +.
**16.50** Бітва экстрасэнсаў.
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Чэхія - Іспанія. Прамая трансляцыя.
**20.55** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.05** Калыханка.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Тэлебарометр.
**21.35** Беларуская часіна.
**22.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.40** «Час футбола. Чэмпіянат Еўропы U-21».
**00.25** Бітва экстрасэнсаў.

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Снежны чалавек. Апошняя відавочнікі». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**22.25** Тэлесерыял «Правілы згону».
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі.ru».
**23.55** Прэм'ера. «Мода для народа». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20, 23.40** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Асабліва небяспечны!».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.25** Вострасюжэтны серыял «Лютасць».
**00.25** «Асабліва небяспечны!».

**EUROSPORT**

**09.30** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**10.00** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**10.30** Тэніс. Турнір ATP. Істборн (Вялікабрытанія). Дзень 2-і.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). Дзень 2-і.
**13.30** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**17.00** Тэніс. Турнір ATP. Істборн (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**21.10** Навіны.
**21.15** Вось дык так!!!.
**21.25** Навіны коннага спорту.
**21.30** Гольф. Тур PGA. Турнір FedEx St. Jude Classic. Мемфіс (ЗША).
**22.30** Абранае па серадах. Госць тыдня.
**22.45** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**22.50** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**22.55** Абранае па серадах.
**23.00** Вось дык так!!!.
**00.00** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**00.55** Навіны.
**01.00** Тэніс. Турнір ATP. Істборн (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Ранча Пікавая Сямёрка», серыял: 9 серыя.
**07.45** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 41 серыя.
**08.45** Сальда (эканамічная праграма).
**09.00** Праект «Будучыня».
**09.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «У дзень кірмашу», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**10.35** «Ранча», серыял: 8 серыя.
**11.25** Невядомая Беларусь: «Рок назаўжды–2», дак. фільм.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Геніяльны аматар», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**12.45** «Ранча Пікавая Сямёрка», серыял: 9 серыя.
**13.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 41 серыя.
**14.10** Сальда (эканамічная праграма).
**14.25** Праект «Будучыня».
**14.50** Паляванне на дзівосы.
**15.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «У дзень кірмашу», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**16.10** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 15 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Пікавая Сямёрка», серыял: 10 серыя.
**17.30** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 10 серыя.
**18.15** «Сакрэтная гісторыя архіпелагу ГУЛАГ», дак. фільм, 2008 г., Францыя.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Хто ёсць кім?: «Кроў і попел Дражна», рэпартаж, 2008 г., Польшча.
**20.00** На колах.
**20.30** Басанож па свеце.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Побач з намі.
**21.40** Вагон.
**21.45** «Дэкалог, дзевяць», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**22.45** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**23.15** Аб'ектыў.

## 16 ЧЭРВЕНЯ, ЧАЦВЕР

**1**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.20** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.35** Відэафільм АТН «Іўеўскі малітваслоў» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** «Сваты». Камедыйны серыял (Украіна). 1-я серыя.
**13.30** Відэафільм АТН «Калумбія».
**14.00** Шэф-кухар.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага».
**16.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 00.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**21.55** «Сваты». Серыял (Украіна). 1-я серыя.
**23.30** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.30** Дзень спорту.

**Н**

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Участак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Серафіма Цудоўная». Шматсерыйны фільм.
**22.05** Фільм «Бачнасць гневу».
**00.10** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.00** Начныя навіны.

**СТВ**

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мiншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дaішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла 2». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Мiншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Дaішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 2». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

**ЛАД**

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** «Рэальны свет».
**09.35** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**10.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**11.10** Дача здароўя.
**11.45** Жансавет.
**12.20** Кінаспробы.
**12.45** «Сафія Слуцкая. Апошняя з роду Алелькавічаў». Дак. фільм (НГТРК).
**13.15** «Бязмежныя людзі».
**13.45** Пазакласная гадзіна.
**14.00** Школьная камедыя «Вакацыі Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя» (СССР). 1-я серыя.
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.25** Прыгодніцкая камедыя «Хільдэгардэ» (Аўстралія).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.25** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** Бітва экстрасэнсаў.
**00.25** Містычны трылер «Фантомы» (ЗША).

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Згуба «Паветранага Тытаніка». Стратанаўты». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**22.25** Тэлесерыял «Правілы згону».
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі.ru».
**23.55** «Паядынак».

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.30** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Асабліва небяспечны!».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцэйны».
**21.25** Вострасюжэтны серыял «Лютасць».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Асабліва небяспечны!».

**EUROSPORT**

**09.30** Вось дык так!!!.
**10.30** Тэніс. Турнір ATP. Істборн (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**13.30** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**17.00** Тэніс. Турнір ATP. Істборн (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**21.10** Навіны.
**21.15** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.15** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**00.50** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.55** Навіны.
**02.00** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Ранча Пікавая Сямёрка», серыял: 10 серыя.
**07.45** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 10 серыя.
**08.35** Побач з намі.
**08.50** Асабісты капітал.
**09.05** Басанож па свеце.
**09.30** На колах.
**09.55** Хто ёсць кім?: «Кроў і попел Дражна», рэпартаж, 2008 г., Польшча.
**10.15** «Сакрэтная гісторыя архіпелагу ГУЛАГ», дак. фільм, 2008 г., Францыя.
**11.10** «Ранча», серыял: 9 серыя.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 15 серыя.
**12.50** «Ранча Пікавая Сямёрка», серыял: 10 серыя.
**13.15** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 10 серыя.
**14.00** Побач з намі.
**14.15** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.45** Басанож па свеце (спазнавaўчая праграма).
**15.10** Хто ёсць кім?: «Кроў і попел Дражна», рэпартаж, 2008 г., Польшча.
**15.30** «Сакрэтная гісторыя архіпелагу ГУЛАГ», дак. фільм, 2008 г., Францыя.
**16.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**16.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял: 2 серыя.
**17.30** «Дэкалог, дзевяць», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**18.30** «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., дак. фільм, Германія: 1 серыя, «Салідарнасць Гэнрыкі».
**19.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**19.55** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Шматфункцыйны помнік», дак. фільм, Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Беларусы ў Польшчы.
**21.40** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**22.30** Рэпартэр.
**23.00** МакраФон: «Рок-карона–2008»: ч. 1.
**23.30** Аб'ектыў.

## 17 ЧЭРВЕНЯ, ПЯТНІЦА

### Беларусь 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона X. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрэсаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** «Сваты». Камедыйны серыял (Украіна). 2-я серыя.
**13.25** «Славянскі базар». Канцэрт.
**14.15** «Сінематэка».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага».
**16.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**17.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**19.30** «Зона X». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** «Сваты». Камедыйны серыял (Украіна). 2-я серыя.
**23.15** Шпіёнскай драме «Ілжывая спакуса» (ЗША).
**01.40** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**02.05** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Участак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Дэтэктыў «Падсадны».
**22.55** Фільм «Красуні».
**01.10** Начныя навіны.

### СТБ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла 2». Серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Фільм «Укол парасонікам». Францыя, 1980 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Відэзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.45** Фільм «Захавальнік». ЗША, 2009 г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**09.05** Прыгодніцкая камедыя «Хільдэгардэ» (Аўстралія).
**10.40** Жывы гук.
**11.25** Баявік «Таямніца Ордэна» (ЗША).
**13.15** Пазакласная гадзіна.
**13.30** Школьная камедыя «Вакацыі Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя» (СССР). 2-я серыя.
**14.40** Усё аб бяспецы.
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**18.00** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**19.05** Прыгодніцкі баявік «Забароненае царства» (ЗША-Кітай).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** Баявік «Таямніца Ордэна» (ЗША).
**23.45** «Час футболу. Чэмпіянат Еўропы U-21».
**00.30** «Пра мастацтва».
**00.55** Бітва экстрасэнсаў.

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.25** Тэлесерыял «Правілы згону».
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** Фільм «Улетку я аддаю перавагу вяселлю».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Справа густу».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Асабліва небяспечны!».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.20** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Лютасць».
**23.05** «Песня для вашага століка».
**00.10** Камедыя «Прадавец».

### Eurosport

**09.30** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**10.30** Тэніс. Турнір ATP. Істборн (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**13.30** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). 1/2 фіналу.
**17.00** Тэніс. Турнір ATP. Істборн (Вялікабрытанія). 1/2 фіналу.
**21.10** Навіны.
**21.15** Скачкі. Агляд тыдня. Часопіс.
**21.45** Вось дык так!!!.
**22.00** Бокс. Турнір Bigger's Better..
**00.15** Цімберспорт. Турнір «Прыз чэмпіёнаў».
**01.10** Навіны.
**01.15** Кіберспорт. Турнір Intel Extreme Masters. Агляд.
**01.45** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). 1/2 фіналу.
**02.15** Вось дык так!!!.

### Белсат tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Чароўнае дрэва», серыял: 2 серыя.
**07.50** «Гняздо», серыял: 3 серыя.
**08.40** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Шматфункцыйны помнік», дак. фільм, Польшча.
**09.10** YoLife!.
**09.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.00** Беларусы ў Польшчы.
**10.15** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**11.05** «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., дак. фільм, Германія: 1 серыя, «Салідарнасць Гэнрыкі».
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Дэкалог, дзевяць», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**13.00** «Чароўнае дрэва», серыял: 2 серыя.
**13.25** «Гняздо», серыял: 3 серыя.
**14.20** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.50** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Шматфункцыйны помнік», дак. фільм, Польшча.
**15.20** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**15.35** «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., дак. фільм, Германія: 1 серыя, «Салідарнасць Гэнрыкі».
**16.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял: 2 серыя.
**17.30** Беларускія лёсы: «Алег Трусаў».
**17.50** Форум (ток-шоу): «Куды пайсці вучыцца?».
**18.35** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.00** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Аўтастопам праз Еўропу.
**20.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Дзіцячая гара», дак. фільм, 2008 г., Румынія–Германія.
**22.25** «Пітбуль», серыял: 15 серыя.
**23.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.20** Аб'ектыў.

## 18 ЧЭРВЕНЯ, СУБОТА

### Беларусь 1

**07.00** Мультфільмы.
**07.25** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** «Шэф-кухар».
**10.50** Меладраме «Разумніца, прыгажуня» (Расія). 1 -я серыя.
**12.10** «Вянок санетаў». Ваенная драма.
**13.40** Патрабуецца.
**13.55** «Зона X». Вынікі тыдня.
**14.20** «Час Саюза». Грамадска-палітычнае ток-шоў.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** Nota Bene.
**16.45** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы».
**17.40** Відэафільм АТН « Спрадвечная талака» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.30** «Месца сустрэчы». Музычна-забаўляльная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Швейцарыя-Беларусь. Прамая трансляцыя.
**23.40** Камедыйны трылер «Бывай, палюбоўнік» (ЗША).

### ОНТ

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** Мультфільм.
**11.40** «Разумніцы і разумнікі».
**12.20** Прэм'ера. «Легендарнае кіно».
**13.20** Камедыя «Паласаты рэйс».
**15.00** Асяроддзе пасялення.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. М.Дзяржавін. Той яшчэ «маторчык».
**17.20** Фільм «Хлопец з бурбалкі».
**18.50** Фільм «Таямнічая выспа».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «Проста разам».
**22.50** «Што? Дзе? Калі?».
**00.00** Канцэрт.

### СТБ

**06.25** Фільм «Нядзельны тата». СССР, 1985 г.
**07.50** Фільм «Укол парасонікам». Францыя, 1980 г.
**09.30** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.00** Фільм «Спортлато - 82». СССР, 1982 г.
**15.45** «Відэзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**16.55** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Крылы анёла». Расія, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.25** Фільм «Апошняя справа Ламаркі». ЗША, 2002 г.
**23.25** Фільм «Асабістае». ЗША, 2008 г.

### ЛАД

**06.40** «Універсальны салдат». Дакументальны фільм (НГТРК).
**07.10** Прыгодніцкі баявік «Забароненае царства» (ЗША-Кітай).
**08.55** Нашы тэсты.
**09.35** Усё аб бяспецы.
**10.05** Рэальны свет.
**10.40** Тэлебарометр.
**10.45** Дыялогі аб рыбалцы.
**11.20** Жансавет.
**11.55** Дача здароўя.
**12.35** «Страсці па культуры».
**13.15** Лабірынты: Эдвард Вайніловіч.
**13.50** «Магія раялю». Музычны форум. Частка 3-я.
**14.45** Серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**15.50** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Беларусь - Вялікабрытанія. Прамая трансляцыя.
**17.35** Баявік «Маёр Вятроў». 1-я, 2-я серыі.
**19.30** Авантурная камедыя «Як абрабаваць банк» (ЗША).
**21.00** КЕНО.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Ісландыя - Данія Прамая трансляцыя.
**23.40** «Час футболу. Чэмпіянат Еўропы U-21».
**00.20** Жывы гук.
**01.05** Валейбол. Еўраліга. Мужчыны. Беларусь - Славакія.

### Россия

**07.00** Фільм «У страляючай глухмені».
**08.35** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Улетку я аддаю перавагу вяселлю».
**13.30** Мультфільмы.
**13.45** «Уся Расія».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма.
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.15** «Улада факту».
**16.05** Прэм'ера. «Вялікая сям'я».
**17.50** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Фільм «Восеньскія кветкі».
**00.20** «Дзяўчаты».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Выратавальнікі».
**08.50** «Медыцынскія таямніцы».
**09.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.15** «Вочная стаўка».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.00** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.00** «Ты не паверыш!».
**22.55** «Апошняе слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**23.55** Камедыйны трылер «11.14».

### Eurosport

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.00** Тэніс. Турнір ATP. Істборн (Вялікабрытанія). 1/2 фіналу.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). 1/2 фіналу.
**14.00, 20.15** Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Вялікабрытанія). Фінал.
**15.45** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Стакгольм (Швецыя). Дзень 1-ы.
**19.00** Тэніс. Турнір ATP. Істборн (Вялікабрытанія). Фінал.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір Total KO.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір Total KO.
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Мексіка.
**01.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Мексіка.
**02.30** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Стакгольм (Швецыя). Дзень 1-ы.

### Белсат tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25, 12.00** «Машына зменаў», тэлесерыял: 2 серыя.
**07.50** Калыханка для самых маленькіх.
**08.30** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**09.20** Праект «Будучыня».
**09.45** «Дзіцячая гара», дак. фільм, 2008 г., Румынія–Германія.
**10.50** МакраФон: «Рок-карона–2008»: ч. 1.
**11.20** Аўтастопам праз Еўропу.
**11.40** Беларускія лёсы: «Алег Трусаў».
**12.30** Калыханка для самых маленькіх.
**13.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**13.15** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**14.05** Праект «Будучыня».
**14.35** Форум: «Куды пайсці вучыцца?».
**15.20** «Бульбаны», мультсерыял.
**15.30** Аблічча таталітарызму: «Сіла бяссільных», дак. фільм.
**16.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 17 серыя.
**17.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**17.55** «Дзіцячая гара», дак. фільм, 2008 г., Румынія–Германія.
**19.00** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.45** Госць «Белсату».
**20.05** Еўропа сёння.
**20.30** Рэпартэр.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** «Алег Бябенін: Я застануся», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**21.30** Суботні сеанс: «Вышук», маст. фільм, 1998 г., Канада.
**23.05** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 3 серыя.
**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.00** Аб'ектыў.

## 19 ЧЭРВЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.15** «Горад майстроў». Фільм-казка.
**08.35** Слова Пастыра Тадэвуша Кандрусевіча.
**08.45** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**10.25** «Культурныя людзі».
**10.55** Меладрама «Разумніца, прыгажуня» (Расія). 2-я серыя.
**12.10** «Альпійская балада». Драма.
**13.50** Сінематэка.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Ведай нашых: беларускія палярнікі».
**15.50** «Слава». Музычная меладрама (ЗША).
**17.35** OFF STAGE LIFE.
**17.55** Суперлато.
**18.45** Меладрама «Рыта» (Расія).
**20.30** У цэнтры ўвагі.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Украіна - Іспанія. Прамая трансляцыя.
**23.40** «Сястрычкі Бенгер». Камедыя (ЗША).

### ОНТ

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00, 16.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** Фазэнда.
**11.50** Лірычная камедыя «Самотным даецца інтэрнат».
**13.20** «Хвіліна славы».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Геніі і злыдні».
**16.50** Шматсерыйны фільм «Прапанаваныя абставіны».
**18.45** «Эстрадны кактэйль».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.05** Фільм «Русалка».
**00.15** Прэм'ера. Андрэй Макарэвіч і «Аркестр крэольскага танга».

### СТВ

**07.05** Фільм «Апошняя справа Ламаркі». ЗША, 2002 г.
**09.00** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.35** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.25** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** Фільм «Дзяўчына без адрасу». СССР.
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.25** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.30** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Нёман» (Гродна) - «Нафтан» (Наваполацк). Прамая трансляцыя.
**22.40** Фільм «Танцуючая ў цемры». Данія - Германія - Нідэрланды, 2000 г.
**01.00** «Прафесійны бокс».

### ЛАД

**07.15** «Дыверцісмет перамогі». Дакументальны фільм (НГТРК).
**07.40** Дабравест.
**08.05** Мір вашай хаце.
**08.20** Авантурная камедыя «Як абрабаваць банк» (ЗША).
**09.50** Медычныя таямніцы.
**10.30** Медычныя таямніцы +.
**10.50** Тэлебарометр.
**10.55** «Шоў зорак сусветнай гімнастыкі. Мінск-2011».
**12.05** Нашы тэсты.
**12.45** Кінаспробы.
**13.05** «Правы чалавека».
**13.20** Гаспадар.
**13.50** «Магія раялю». Музычны форум. Частка 4-я.
**14.50** Серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**15.50** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Ізраіль - Беларусь. Прамая трансляцыя.
**18.00** Баявік «Маёр Вятроў». 3-я, 4-я серыі.
**19.55** Смешная часіна.
**20.30** «Навіны надвор'я».
**21.00** «Спортлато 5 з 36».
**21.05** КЕНО.
**21.10** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Англія - Чэхія. Прамая трансляцыя.
**23.40** «Час футболу. Чэмпіянат Еўропы U-21».
**00.20** Культасвет.
**00.50** Валейбол. Еўраліга. Мужчыны. Беларусь - Славакія.

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.35** Фільм «Восеньскія кветкі».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «З новай хатай!».
**12.25** Фільм «На паўдарозі ў Парыж».
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Рамантыка рамансa».
**15.45** «Гэтая жорсткая спадарыня поспех». Дакументальны фільм.
**16.40** Фільм «Заўтра была вайна».
**18.20** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Фільм «Каханне да запатрабавання».
**23.00** «Адмысловы карэспандэнт».

### НТВ

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.20** «Першая перадача».
**10.50** «Баль на ўвесь свет».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**14.15** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**16.20** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**17.15** «І зноў добры дзень!».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** Прэм'ера. «22 чэрвеня. Фатальныя рашэнні».
**23.40** «Гульня».
**00.30** «Нерэальная палітыка».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Кваліфікацыя. Брно (Чэхія).
**10.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Warm-up. Брно (Чэхія).
**10.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Германія). Гонка 1-я.
**11.00** Вось дык так!!!.
**11.30** Акадэмічнае веславанне. Кубак свету. Гамбург (Германія).
**12.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. Валенсія (Іспанія).
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Валенсія (Іспанія). Заезд 1-ы.
**13.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Раўнд 9-ы. Брно (Чэхія).
**14.45** Аўтаспорт. Аўта ГП. Брно (Чэхія). Гонка 2-я.
**15.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Раўнд 10-ы. Брно (Чэхія).
**16.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. Валенсія (Іспанія). Заезд 2-і.
**17.30** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Стакгольм (Швецыя). Дзень 2-і.
**19.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Валенсія (Іспанія).
**19.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Германія). Гонка 2-я.
**20.00** Матаспартыўны часопіс.
**20.15** Акадэмічнае веславанне. Кубак свету. Гамбург (Германія).
**21.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Мексіка.
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Мексіка.
**01.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Мексіка.
**02.15** Матаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15, 13.20** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 17 серыя.
**08.00** Калыханка для самых маленькіх.
**08.35** Рэпартэр.
**09.00** Еўропа сёння.
**09.25** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял.
**10.15** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.40** «Алег Бябенін: Я застануся», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**10.55** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.05** Госць «Белсату».
**11.25** «Вышук», маст. фільм, 1998 г., Канада.
**12.55** «Права быць свабодным» (канцэрт альтэрнатыўнай музыкі Луцк-2007): ч. 2, выступ гурта «Індыга».
**14.10** «Дзіцячая гара», дак. фільм, 2008 г., Румынія–Германія.
**15.10** Еўропа сёння.
**15.35** Госць «Белсату».
**15.55** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**16.20** «Ліст з Малдовы», дак. фільм, 2009 г., Румынія.
**16.50** «Бульбаны», мультсерыял.
**17.00** Прыватная калекцыя.
**17.20** «Час гонару», серыял: 33 серыя.
**18.05** Чаму дэмакратыя?: 3 серыя: «Таксі ў цемру».
**19.00** Басаногі на свеце.
**19.25, 20.25** Вагон.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.00** На колах.
**20.35** Без рэтушы: «Кітайцы атакуюць», рэпартаж.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Маўчанне Лорны», маст. фільм, 2008 г., Германія–Францыя–Італія–Бельгія.
**23.35** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.45** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга;
Бабруйск: (8029) 628 75 01, Вольгаю

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема ______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

| Счет получателя | 3012741108019 | Лицевой счет | Код 739 |
|---|---|---|---|
| УНП* | 190790926 | | |

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня

Кассир Всего

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ПРАТЭСТ

# МАНГОЛЫ СУПРАЦЬ ПРЫГНЁТУ

Алег НОВІКАЎ

**У абхопленай пратэстамі кітайскай правінцыі Унутраная Манголія ўведзена ваеннае становішча. Пасля тыбетцаў і уйгураў незалежнасці патрабуюць манголы.**




У аўтаномным раёне Унутраная Манголія на поўначы Кітая працягваюцца хваляванні. У акцыях пратэсту, якія праходзяць у наваколлях горада Шылін-Хот, бяруць удзел тысячы манголаў, галоўным чынам школьнікі са старэйшых класаў. Па звестках міжнароднай праваабарончай арганізацыі «Amnisty International», у некаторых раёнах Унутранай Манголіі нават уведзена ваеннае становішча.

Дэманстранты патрабуюць пакараць вінаватых у забойстве Мергена, лідара мангольскіх фермераў. Апошні спрабаваў перакрыць праезд грузавікам з вугалем, абараняючы землі для выпасу. Як паведамляюць мясцовыя крыніцы, 10 мая 24-тонавы грузавік з вугалем, у кабіне якога былі два ханьца (карэнная этнічная група Кітаю), зрабіў наезд на Мергена. Адпаведна сведкам, колы правалаклі яго цела прыкладна 150 метраў.

Мясцовыя ўлады спрабуюць замяць інцыдэнт, што выклікала абурэнне ў жыхароў мангольскай нацыянальнасці. Аднак глабальным чыннікам пратэстаў з'яўляецца пагроза знікнення традыцыйнага ладу жыцця этнічных манголаў. Паколькі Пекін абвясціў Унутраную Манголію «энергетычнай базай Кітая», заахвоціў горназдабываючыя кампаніі адкрываць у рэгіёне вугальныя шахты і адначасова ажыццяўляе прымусовае перасяленне адсюль мясцовых жывёлаводаў. У выніку дзясяткі тысяч мангольскіх пастухоў былі змушаны змяніць свой лад жыцця і, як вынік, страцілі сродкі да існавання. Адной з ахвяр эканамічнай палітыкі, якую праводзіў Пекін, быў той самы нябожчык Мерген.

Зараз галоўнае пытанне, якое цікавіць экспертаў, — ці набудуць пратэсты палітычныя, у першую чаргу нацыянальна-вызвольныя лозунгі? На першы погляд, пытанне гучыць не па адрасе. Этнічныя манголы ў рэгіёне з'яўляюцца меншасцю — іх тут меней за 20 працэнтаў з 24 мільёнаў насельніцтва Унутранай Манголіі. Шматлікія манголы, якія навучаюцца ў кітайскіх школах, на мангольскай мове размаўляюць мала ці наогул не ведаюць яе.

З другога боку, існуе доўгая традыцыя барацьбы ўнутраных манголаў за незалежнасць ад Пекіну. Народы, якія засялялі тэрыторыю Унутранай Манголіі, гістарычна ніколі не былі часткай Кітая. Яны перыядычна падзяляліся на паўднёвую і паўночную орды, або на заходнюю і ўсходнюю орды, змагаліся паміж сабой і былі таксама звязаныя з палітычнымі працэсамі ў так званай Знешняй Манголіі (цяперашняя Мангольская Народная Рэспубліка).

У 1691 годзе Унутраная і Знешняя Манголіі сталі часткай Цыньскай імперыі. У пачатку XX стагоддзя была абвешчаная незалежнасць Знешняй Манголіі, якая, праўда, хутка трапіла пад пратэктарат Расіі. Усе кланы Унутранай Манголіі пажадалі ўвайсці ў дзяржаўнае фармаванне, аднак Расія і Японія дамовіліся, што Унутраная Манголія захаваецца як сфера ўплыву Японіі, застаючыся фармальна ў складзе Кітаю.

Падчас Другой сусветнай вайны некаторыя князі Унутранай Манголіі спрабавалі абапірацца на Японію, каб выйсці з-пад кантролю кітайскай адміністрацыі. Ужо ў 1934 годзе нацыяналісты арганізавалі антыкітайскі мяцеж. Нанкін — тагачасная сталіца Кітаю — быў вымушаны надаць краю аўтаномію. У кіраўніцтве руху мангольскіх нацыяналістаў быў князь Дэ Ван Дэмчыгдонраў. У наступным годзе ён дабіўся ад японцаў згоды на стварэнне дзяржаўнага ўтварэння Мэнцзян, прэзідэнтам якога сам і стаў.

Мэнцзян меў усе знешнія атрыбуты дзяржаўнасці — сімволіку, валюту, банкаўскую сістэму, пошту і г.д. — хаця па статусу быў ніжэй за іншыя марыянетачныя японскія рэжымы кшталту Маньчжурыі. Паколькі большасць насельніцтва была кітайцамі, Мэнцзян разглядалі як адміністратыўную адзінку Кітаю, хаця і аўтаномную. Аднак з часам Дэ Ван Дэмчыгдонраў дабіўся ад японцаў змены дзяржаўнай канцэпцыі. Мэнцзян стаў разглядацца як выключна мангольская дзяржава. У 1943 годзе край перайменавалі ў Мангольскую Аўтаномную Федэрацыю. Быў узяты курс на мангалізацыю тубыльцаў.

У жніўні 1945 года войска Мангольскай Народнай Рэспублікі ў рамках дапамогі наступу Чырвонай Арміі супраць Квантунскай арміі, уступіла ва Унутраную Манголію. Узнікла ідэя аб'яднання абодвух Манголій. Аднак хутка пасля вызвалення Унутраная Манголія была пакінутая мангольскімі войскамі. Прычынай сталі планы Сталіна па «інтэграцыі» Кітая ў межах маньчжурскай імперыі Цын для супрацьстаяння ЗША на Далёкім Усходзе.

Дэ Ван Дэмчыгдонраў спрабаваў узняць паўстанне супраць уключэння Унутранай Манголіі ў склад КНР, аднак без асаблівых вынікаў. У 1949 годзе ён эміграваў у Манголію, дзе спачатку як вядомы патрыёт быў горача сустрэты суайчыннікамі. Аднак ужо ў лютым 1950 года быў арыштаваны органамі бяспекі перададзены ў рукі ўлад КНР як падрыўны элемент. У наступныя гады, знаходзячыся пад назіраннем кітайскіх спецслужбаў, Дэмчыгдонраў працаваў у музеі гісторыі Унутранай Манголіі і нават напісаў дзевяць тамоў мемуараў. Памёр Дэ Ван Дэмчыгдонраў праз 13 гадоў пасля апісаных падзей у 64-гадовым узросце.

Аднак ягоная справа не памерла. У мангольскай эміграцыі існуе як мінімум дзве партыі, і абедзве яны выступаюць за выхад Унутранай Манголіі са складу Кітаю. Гаворка пра Мангольскі Дэмакратычны Альянс і Народную партыю Унутранай Манголіі. Наўрад ці трэба пераацэньваць іх палітычную вагу, аднак паўплываць на праграмныя лозунгі пратэстуючых ва Унутранай Манголіі жывёлаводаў і школьнікаў яны здольныя.

На цяперашні момант перспектывы пратэстаў з'яўляюцца незразумелымі. У тым ліку з-за таго, што сёння Унутраная Манголія ў інфармацыйным плане практычна ізаляваная кітайскімі ўладамі ад свету. Эксперты пагаджаюцца ў адным — цяперашнія дэманстрацыі ва Унутранай Манголіі лічацца самымі маштабнымі ў краі за апошнія 20 гадоў. У дадатак гэта нешта новае. Пратэсты на нацыянальнай глебе вельмі рэдкія для гэтай вобласці, у адрозненне ад іншых праблемных рэгіёнаў Кітая.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Аляксандру Лукашэнку ўдавалася быць ва ўладзе на працягу 17 гадоў, з большага дзякуючы яго здольнасці сутыкаць Расію і Захад. Такі прыём ён выкарыстоўваў на гэтым тыдні, звярнуўшыся да Міжнароднага валютнага фонду з просьбай даць крэдыт да васьмі мільярдаў долараў. Калі МВФ яго падтрымае, то ўзмацніць пазіцыю беларускага аўтакрата ў адносінах да Расіі, якая таксама прапанавала Мінску дапамогу, хоць з выкананнем цвёрдых умоў. Сябры МВФ з ЗША і Еўрапейскага Саюза наўрад ці падтрымаюць Беларусь у святле дзеянняў улады ў адносінах да дэмакратычнай апазіцыі пасля снежаньскіх выбараў, калі шматлікія актывісты і лідары апазіцыі атрымалі працяглыя турэмныя тэрміны. Гэта памяншае здольнасць Лукашэнка гандлявацца з Расіяй.

**«Financial Times» (Вялікабрытанія)**

Лукашэнка, незадаволены патрабаваннямі Расіі прадаць дзяржмаёмасць у абмен на крэдыты, звяртаецца па дапамогу ў МВФ. «Можна паспрачацца, ці варта МВФ наогул даваць крэдыты Беларусі. Новая праграма МВФ магла б зменшыць кантроль Лукашэнкі над эканомікай і заахвоціць канкурэнцыю. Пазіцыі Лукашэнкі на перамовах са МВФ будуць слабымі. А без рэформаў ёсць рызыка новых дэвальвацый, абвалу эканомікі і інфляцыі.

**«The Wall Street Journal» (ЗША)**

Беларусы развучыліся пратэставаць і прывыклі трываць. Але зараз усё насельніцтва на сваёй кішэні, на прыкладзе сваіх пустых халадзільнікаў пераканалася: сакрэтны пакт з уладай разарваны ў аднабаковым парадку. Насельніцтва не можа не задумацца пра тое, ці патрэбна яму такая ўлада. Не можа не задумацца пра палітыку. А ў тым, што гэты моцны, ганарлівы народ здольны на многае, сумнявацца не варта.

**«Ведомости» (Расія)**

«Тым часам любы шлях без выключэння да выйсця з крызісу абавязкова ўключае (як найважную частку!) той ці іншы пераход да сітуацыі, калі ўлада будзе кантраляваць зусім не ўсё. Але на скарачэнне сваёй усеўладнай улады Лукашэнка не згодзен настолькі катэгарычна, што ніводны эксперт не возьмецца сёння прадказаць, да чаго можа прывесці антаганізм паміж патрабаваннямі эканамічнага разумнага сэнсу і настроямі прэзідэнта.

**«Вести» (Расія)**

Першы транш 3-мільярднага доларавага крэдыту (памер транша — 800 мільёнаў долараў) у Мінску чакаюць у бліжэйшыя два тыдні. Яшчэ пяць траншаў па 440 мільёнаў могуць пералічыць на працягу трох гадоў пры выкананні ўмоў стабілізацыі аплатнага балансу і падвышэння канкурэнтаздольнасці эканомікі. Беларускія эксперты упэўнены, што ўмовы — невыканальныя.

**BBC (Вялікабрытанія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГРЭЦЫЯ. КАНСТАНЦІНОПАЛЬ – ГРЭКАМ

Нягледзячы на крызіс, грэкі-нацыяналісты не забылі адзначыць дату 23 мая. У гэты дзень у далёкім 1453 годзе падчас абароны Канстанцінопаля ад туркаў загінуў апошні візантыйскі імператар Канстанцін XI. Цяпер гэты дзень лічыцца днём барацьбы грэкаў за вяртанне ў склад Грэцыі Канстанцінопаля, які туркі, як вядома, перайменавалі ў Стамбул. 23 мая каля тысячы сяброў «Арганізацыі нацыянальнай памяці» сабраліся каля помніка імператару Канстанціну ў Афінах, каб патрабаваць аднаўлення гістарычнай справядлівасці. Праўда, выступоўцы прызнавалі, што змена межаў з Турцыяй — справа нялёгкая і патрабуе шмат часу. Таму на гэтым этапе яны будуць задаволеныя, калі ўрад будзе больш жорсткім адносна эмігрантаў з ісламскіх краін. Зараз нацыяналісты ахвотна спекулююць на смерці 44-гадовага грэка, якога эмігранты з Пакістану закалолі нажамі, каб забраць камеру, з дапамогай якой той збіраўся здымаць вяселле сваёй дачкі. Акцыя за вяртанне Канстанцінопаля закончылася маршам па цэнтры сталіцы.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### РАСІЯ. БУДЗЕ КАТАРГА БЕЗ ПРАВА ПЕРАПІСКІ?

У Маскве адбыўся Кангрэс па крымінальнаму праву, на які сабраліся самыя вядомыя юрысты Расіі. У фінальнай рэзалюцыі яны заклікалі ўрад да рэформы Крымінальнага кодэксу. Найбольш радыкальную рэформу прапанаваў кіраўнік камітэта Савету Федэрацыі па канстытуцыйным заканадаўстве, заслужаны юрыст Расіі Аляксей Аляксандраў. Ён выступіў з праектам увесці ў крымінальнае права пакаранне ў выглядзе цяжкой фізічнай працы без амністыі, памілавання, спатканняў і перапіскі. Такія меры, на яго думку, варта прымаць у адносінах да людзей, якіх асудзілі па артыкулах «тэрарызм», «гандаль наркотыкамі», «забойства дзяцей». «Катаржныя працы маглі б па-сутнасці замяніць смяротнае пакаранне», — паведаміў Аляксандраў. Ідэя адразу выклікала пратэсты праваабаронцаў, якія лічаць, што прапанова караць катаргай юрыдычна некарэктная і супярэчыць міжнароднаму праву. Праўда, яны вымушаны прызнаць, што нешта ў гэтай сферы трэба рабіць, паколькі насельніцтва дасюль у большасці лічыць, што пажыццёвае зняволенне не кампенсуе смяротнага пакарання.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### МАЛДОВА. ПРЫДНЯСТРОЎЕ – ЗА ШЭНГЕН

Як піша аўтарытэтная кіеўская газета «Дзеркало Тижня», Масква рыхтуе здачу Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі (ПМР). Пра гэта, на думку газеты, сведчаць аднаўленне перамоваў па прыднястроўскаму канфлікту. Справа ў тым, што апошні раз яны мелі месца 5 гадоў таму. З таго часу Ціраспаль (відавочна, не без падтрымкі расійскіх партнёраў) блакаваў магчымасць аднаўлення перамоўнага працэсу, патрабуючы абы чаго — пачынаючы з нармалізацыі знешнеэканамічнай дзейнасці рэгіёна і заканчваючы атрыманнем міжнародных гарантый рэалізацыі раней дасягнутых дамоўленасцяў. Аднак апошнім часам сітуацыя змянілася. Падчас сустрэчы ў Калінінградзе паміж дырэктарамі МЗС Расіі, Польшчы і Германіі міністру Лаўрову быццам зрабілі прапанову, ад якой цяжка адмовіцца. Крэмль дае санкцыю на інкарпарацыю Прыднястроўя ў склад Малдовы. І атрымлівае бязвізавы рэжым з ЕС. Цяжка сказаць, наколькі гэта версія мае права на існаванне, аднак згода прэзідэнта ПМР Смірнова на кансультацыі кажа, што нейкі прэсінг з боку Масквы на яго існуе. Хаця зусім не значыць, што Ціраспаль так проста пагодзіцца стаць падкантрольным Кішынёву. Ёсць яшчэ і Кіеў, які таксама ўдзельнічае ў перамовах і, хутчэй за ўсё, заблакуе любое канструктыўнае рашэнне, пакуль не атрымае нейкі бонус. Менавіта да такога падыходу заклікае «Дзеркало Тижня».

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. ЦЯЖАРНАСЦЬ ДАПАМОЖА ВЫЙГРАЦЬ ВЫБАРЫ



Справа Дамініка Строс-Кана ўзняла рэйтынг цяперашняга прэзідэнта Ніколя Саркозі. Гэта вынікае з дадзеных сацыялагічных апытанняў інстытуту BVA. Пасля таго, як Дамініка абвінавацілі ў сэксуальным дамаганні, рэйтынг даверу да Саркозі вырас на 4 працэнты і складае 35. Увогуле, гэта самы высокі рэйтынг гаранта з пачатку года. Хаця лічба і невялікая, яна робіць Саркозі фаварытам прэзідэнцкіх выбараў у наступным годзе. Справа не ў тым, што яго ным галоўным канкурэнтам лічыўся менавіта Дамінік Строс-Кан, сябра апазіцыйнай партыі сацыялістаў, які з-за скандалу стаў палітычным нябожчыкам. Таксама на настроі выбаршчыкаў уплывае канфрантацыя ўнутры сацыялістаў, якую выклікаў сыход Строс-Кана. Застаецца нацыяналістка Марына Ле Пэн, якая спрабуе атакаваць Саркозі з правых пазіцый. Супраць Марыны прэзідэнт падрыхтаваў асаблівую зброю. Гаворка пра дзіця, якое ў час выбарчай кампаніі павінна нарадзіць яго жонка Карла Бруні (на днях яна прызналася ў цяжарнасці). На думку прэсы, гэта будзе такім моцным піярам, асабліва для кансерватыўнай часткі французскага грамадства, які не пакіне Ле Пэн ніякіх шансаў на перамогу.

**Па матэрыялах французскай прэсы**

ЦІКАВА

# ЛАЯНКА Ў ПОЛЬСКАЙ ПАЛІТЫЦЫ




Алег НОВІКАЎ

**Газета «Rzeczpospolita» правяла цікавае даследаванне гісторыі выкарыстання лаянкі ў польскай палітыцы. Прапануем аўтарызаваны скарочаны пераклад.**

«Рэч Паспалітая — бардэль, канстытуцыя — канстытутка, а дэпутаты — казлы», — ахвотна казаў на публіцы Ёзэф Пілсудскі. «Хай гэтае быдла ведае, што я пра іх думаю», — гэтую фразу прыпісваюць Уладзіславу Гамулку, першаму сакратару Польскай аб'яднанай працоўнай партыі (PZPR) 1950–1960-х гадоў. Трансфармацыя палітычнай мадэлі не вельмі паўплывала на палітычны лексікон за Бугам. Так, Лех Валенса звяртаўся да прэзідэнта Леха Качыньскага не інакш, як «сук…н сын». Таксама ў палітычных салонах папулярныя словы: «вычварэнец», «дэбіл», «га…но».

Ці можна лічыць ужыванне такіх слоў і выразаў нейкім хамствам або гэта частка лакальнай палітычнай культуры? — задаецца пытаннем польская прэса.

Наўрад ці палякі былі першапраходцамі. Так, Напалеон называў Шарля Талейрана, кіраўніка свайго замежнага ведамства, які пасля здрадзіў яму, «гаў…о ў панчохах».

У дадатак брыдкія словы ўспрымаліся грамадствам па-іншаму на розных этапах яго эвалюцыі. Так, на пачатку існавання Другой Рэчы Паспалітай, здавалася, непрыгожае слова «гной», якое часта адрасавалася дэпутатам ад сельскіх партый, было нормай.

Філолагі таксама лічаць, што насычанасць палітычнага жаргону лаянкай залежыць ад канкрэтнай гістарычнай сітуацыі. Тое, што той жа Пілсудскі актыўна выкарыстоўваў лаянку, часткова было звязана з духам часу. Амаль уся тагачасная палітычная эліта Польшчы прыйшла ў міністэрствы з фронту, дзе лексічныя нормы, як вядома, спецыфічныя.

Яшчэ адзін цікавы момант: шмат хто з тагачасных палітычных дзеячаў, уключаючы Пілсудскага, раней захапляўся сацыялістычнымі ідэямі. Ужыванне простых і моцных народных выразаў лічылася сярод гэтай групы палітыкаў нават своеасаблівым шыкам, сімвалам сувязі з простым народам. У гэтым плане «моцнае слова» было формай палітычнага піяру. Той жа Пілсудскі цудоўна ведаў мастацкую літаратуру і пры нагодзе мог нават цытаваць вершы. Гэтыя дэкламацыі выглядалі ў вачах тых жа арыстакратаў цалкам натуральна.

Сітуацыя з практыкай выкарыстання лаянкі ў польскай палітыцы цалкам змянілася ў савецкія часы. Палітычная мова стала больш нуднай. Тыпаж трыбуна і аратара, здольнага імправізаваць, падбудоўвацца пад аўдыторыю, парываць праціўніку нават часам з дапамогай ненарматыўнай лексіцы, быў не запатрабаваны. Камуністычныя палітыкі ў сваіх прамовах карысталіся наборам шаблонаў пра «партыю як вядучую сілу польскага народу», пра «неразрыўнае сяброўства з Масквой» і «сталыя правакацыі імперыялізму».

Увогуле, можна падазраваць, што ўсе тэксты тагачасных публічных прамоў былі загадзя напісаныя і, магчыма, нават адрэдагаваныя адпаведным органам. Такая моўная стылістыка на публіцы відавочна не адпавядала быту. Сведкі кажуць, што на пасяджэннях у цэнтральнай сядзібе PZPR за словамі ў кішэню не лезлі. Асам у гэтай галіне лічыўся Гамулка. Часам ён дазваляў сабе казаць пры людзях моцныя словы.

У часы Герэка, які лічыўся інтэлектуалам, атмасфера ў партыйных офісах змянілася. Першы сакратар папрасіў, каб кіраўнікі PZPR пачалі называць адзін аднаго выключна на «Вы».

Трэба адзначыць, што строгія лексічная рамкі для камуністычных чыноўнікаў, часам дазвалялі ім не дэманстраваць сваё сапраўднае аблічча. Чаго нельга сказаць пра часы Трэцяй Рэчы Паспалітай. Адсутнасць усялякіх нормаў дазваляла палітыкам казаць рэчы, якія, як мінімум, выклікалі неразуменне. Малазразумелыя псеўданавуковыя штампы пра «імперыялізм» змяніліся заявамі, якія таксама ўтрымліваюць мала сэнсу. Напрыклад, лібералы з «Грамадзянскай платформы» ўвесь час абвінавачваюць палітычнага праціўніка Яраслава Качынькага ў тым, што ён збіраецца «падпаліць Польшчу». Што гэта значыць?

«Rzeczpospolita» адзначае, што сярод прадстаўнікоў эліты час ад часу назіраюцца спробы надаць сабе рэнаме інтэлектуалаў. Аднак пакуль яны выглядаюць карыкатурнымі. Узгадваюць, як кансерватар Марыюш Камінскі паспрабаваў атакаваць у Сейме прэм'ера Дональда Туска цытатай з Сервантэса: «Чалавек без гонару горшы за смерць». Нават сябры па фракцыі не зразумелі такога выбрыку і раскрытыкавалі Марыюша за дэмагогію.

У гэтым плане значна цікавей за цытаты Сервантэса гучаць характарыстыкі, якія ў свой час польскія палітыкі прыпісалі сваім апанентам: «поўны нуль», «вяскоўец», «дэбіл палітычнай сцэны», «хворы дэбіл», «палітычны зомбі», «псіхічны вычварэнец».

Аднак такі каскад абразаў, на думку «Rzeczpospolita», не значыць рэгрэсію ў параўнанні з часамі камунізму. Лаянка з боку міністраў не ўспрымаецца ў грамадстве так, як у часы дыктатуры PZPR. Калі раней чыноўнік дапускаў падобныя выразы, гэта значыла, што ён быў не на жарт раз'юшаны. Словы таго ж Герэка пра намер «мець у ду...у» страйкуючых рабочых у Радоме значылі адкрытую пагрозу іх жыццю і свабодзе.

Сёння ненарматыўная лексіка гучыць як некантраляваны спантанны псіхічны зрыў, за якім няма жадання непасрэдна фізічна знішчыць апанента. А тое, што пасля прэса тыражуе факт лаянкі і смяецца з яе аўтара, прымушае палітыка быць больш асцярожным у наступны раз. Прынамсі, так лічыць «Rzeczpospolita».

Аднак, каб выданне не западозрылі ва ўзурпацыі думкі, на ўсялякі выпадак напрыканцы «Rzeczpospolita» ўзгадвае яшчэ адзін славуты афарызм Ёзэфа Пілсудскага: «Думка — як ду...а. У кожнага свая».

МЕРКАВАННЕ

# АПОШНІЯ ВЫБАРЫ ЖЫРЫНОЎСКАГА

**У Расіі зачыняюцца правыя радыкальныя арганізацыі, адначасова ходзяць чуткі, што Жырыноўскага пазбавяць статуса штатнага думскага нацыяналіста. Што стаіць за апошнімі падзеямі? Пра гэта журналісту «НЧ» Алегу Новікаву расказвае расійскі палітолаг Дзмітрый Касценка.**

***— Суд Уладзімірскай вобласці забараніў «Рускі агульнанацыянальны саюз», прызнаўшы яго экстрэмісцкай арганізацыяй. РОНС стаў ужо трэцім нацыяналістычным аб'яднаннем, зачыненым за апошні час у Расіі. Што стаіць за гэтай зачысткай?***

— Зачыстка пачалася па слядах снежаньскіх падзей на Манежнай плошчы. Выступы фанатаў — індыкатар глыбінных праблем у настроях грамадства, заснаваных, у прыватнасці, на непрыманні карумпаваных сувязяў выхадцаў з каўказскага і азіяцкага рэгіёнаў з расійскімі органамі ўлады. Меравіта гэта сітуацыя і нараджае той аб'ектыўны кампанент незадаволенасці, які, хутчэй за ўсё, атрымаў выхад на Манежнай. У грамадзян узнікае адчуванне нацыянальнай няроўнасці рускіх ва ўласнай краіне. Чым і паспяхова карыстаюцца разнастайныя экстрэмісцкія арганізацыі. Такога кшталту структур у краіне цяпер налічваецца каля трох дзясяткаў. З іх забароненыя: Нацыянал-бальшавіцкая партыя, Рух супраць нелегальнай іміграцыі (ДПНИ) і Славянскі саюз і РОНС. Тры апошніх забаранілі за апошнія тры месяцы. Думаю, на гэтым працэс не закончыцца.

***— Узнікае падазрэнне, што крыжовы паход супраць нацыяналістаў — выкананне замовы Крамлю. Наколькі судовыя працэсы па закрыцці трох арганізацый былі справядлівыя?***

— Тое, што пасля Манежнай плошчы інтарэс праваахоўных структур да экстрэмістаў узрос, цалкам заканамерна. Знайсці ў дзеянні любой нацыяналістычнай групоўкі элемент крыміналу вельмі лёгка. У выпадку РОНС проста згадалі справу Сяргея Хлупіна, якога вінавацяць у выбуху ў храме Кірылы і Мяфодзія ва Уладзіміры і «перашкодзе правядзенню канцэрту папулярнага выканаўца» Барыса Маісева. Пра жаданне ўладаў паслядоўна змагацца са скрайне правымі сведчыць і справа Мікіты Ціханава і Яўгеніі Хасіс (забойцы адваката Маркелава, вядомага сваімі левымі поглядамі). Вердыкт парушыў традыцыю, калі людзей, якія абвінавачваліся ў гучных злачынствах на нацыянальнай глебе, адпускалі з залы суда дзякуючы апраўдальнаму вердыкту прысяжных. Ціханаву нечакана далі вышэйшую меру — пажыццёвы тэрмін.

***— Наколькі дзеянні ўладаў па барацьбе з правымі радыкаламі можна лічыць эфектыўнымі?***

— Тыя ж нацыянал-бальшавікі працягваюць функцыянаваць. Таксама як ДПНИ і Славянскі саюз, якія цяпер таксама называюцца па-іншаму. Пытанне — наколькі паспяхова? Нават сімвалічны адміністратыўны ціск здольны выклікаць жах у бюргераў, у патэнцыйных спонсараў, у тых, хто працуе на дзяржаўнай пасадзе. Рэпрэсіі маргіналізуюць нацыяналістаў, якія выступаюць у тым ліку супраць сістэмных нацыяналістычных партый. Нацыяналістычнаму электарату ў такіх умовах нічога не застаецца, як галасаваць за Жырыноўскага, якога ў Крамлі яшчэ 15 гадоў таму прызначылі штатным нацыяналістам.

***— Жырыноўскі спраўляецца з роляй галоўнага патрыёта?***

— Гэта вельмі цікавае пытанне. Варта адзначыць, што Уладзімір Вольфавіч заводзіць сваю душашчыпальную арыю «пра абарону рускіх» практычна перад кожнымі выбарамі. Але адразу ж па заканчэнні выбарчага сезону лідар ЛДПР імкліва забывае «патрыятычныя матывы». Доўгі час выбаршчык, заклапочаны нацыяналістычнай ідэнтыфікацыяй, галасаваў за ЛДПР амаль аўтаматычна. Аднак зараз Жырыноўскі пайшоў у тыраж. А пасля таго, як на хвалі этнічных пагромаў з'явілася ДПНИ, жырыноўцы цалкам згубілі манапольнае права на нацыяналізм. І яны гэта разумеюць. Інакш, напрыклад, перад выбарамі ў сталічную думу ў 2005 годзе прадстаўнікі ліберал-дэмакратаў з дэпутатам Дзяржрдумы ад ЛДПР Мікалаем Кур'яновічам не былі заўважаны на першым «Рускім маршы» (галоўная штогадовая вулічная акцыя расійскіх нацыяналістаў). Аднак ужо ў наступным годзе, якраз пасля выбараў, удзел Кур'яновіча ў падрыхтоўцы «Рускага марша–2006» каштаваў яму выключэння з ЛДПР. Жырыноўскі тады заявіў: «Мы — не экстрэмісты, мы — звычайная, законная апазіцыя, мы выключылі са сваіх шэрагаў экстрэміста Кур'яновіча».

***— ЛДПР здольная прайсці ў Думу ўвосень?***

— А нашто ў такім выпадку 24 мая Вольфавіч зноў выраšыў устаць на слізкую дарожку «сяброўства» з нацыянал-маргіналамі? Лідар ЛДПР сабраў «увесь гербарый» вулічных нацыянальных палітыкаў, запрасіўшы лідараў забароненых арганізацый, ДПНИ, Славянскага саюзу. Пра тое, што ў здольнасць Жырыноўскага прыцягваць галасы нацыяналістычнага электарату, усё менш вераць наверсе, кажа яшчэ адзін факт. На днях у Расію вярнуўся Дзмітрый Рагозін, адзін з лідараў былой сацыял-патрыятычнай партыі «Родина». Пасля краху праекту «Родина» ён працаваў прадстаўніком Расіі пры ЕС, аднак цяпер ён чамусьці вярнуўся. І не паспеў вярнуцца, як пад яго зарэгістравалі арганізацыю Кангрэс расійскіх абшчын (КРО). Сам Рагозін не хавае, што ў краіне існуе вялікі грамадскі запыт на з'яўленне легальнай нацыяналістычнай сілы і хоча скарыстацца момантам.

***— Складваецца ўражанне, што ўлада спрабуе ліквідаваць усе нізавыя цэнтры каардынацыі нацыяналістычнай апазіцыі.***

— Цалкам лагічная здача з улікам таго, што на носе гадавы выбарчы цыкл. Думскія выбары ўвосень даюць старт прэзідэнцкай кампаніі. Нацыяналістычная тэма будзе вельмі важнай на выбарах, і ўлада жадае цалкам кантраляваць гэты дыскурс. Для гэтага будзе паслаблены арганізацыйны і інфармацыйны рэсурс правых. Што зараз і робіцца. Такім чынам, ніякі новы Манеж (гэта зараз любімая фішка нацыяналістычных інтэлектуалаў) уладзе пагражаць не будзе. Пратэст абмяжуецца фанацкімі рэчоўкамі і сутыкненнямі з паліцыяй.

***— Між тым у ліберальнай апазіцыі таксама ёсць чым адказаць. Гэта ўстаноўка на арганізацыю ў дзень прэзідэнцкіх выбараў Майдану. Ці можа Майдан і Манеж аб'ядноўвацца на базе агульных патрабаванняў?***

— У рамках расследавання падзей 11 снежня на Манежнай плошчы былі затрыманыя некаторыя прыхільнікі ліберальных радыкальных структур: НБП, «Стратэгія 31» «Іншая Расія». Аднак, хутчэй за ўсё, актывісты дэмсілаў аказаліся на Манежы выпадкова. Хаця нельга адмаўляць таго, што дзбаты наконт магчымага альянсу нацыяналістаў і лібералаў існуюць. І, здаецца, гэта выклікае насцярожанасць ва ўладзе. Так, блізкія да Крамлю выданні раздулі з мухі слана наконт заявы ліберальнага блогера Аляксея Навальнага пра тое, што «пераход да стварэння нацыянальна-дэмакратычнага руху можа стаць шляхам адраджэння дэмакратычнага руху». Аднак наколькі такі блок магчымы? Мы ўсе ведаем, што на кіеўскім Майдане былі як нацыяналісты, так і лібералы. Аднак лідары першых і другіх выйшлі ў свой час з Народнага Руху, у іх было нешта агульнае. А што аб'ядноўвае паслядоўнага лібералa і Аляксандра Поткіна, нацыяналіста, які казаў, што «для ўступлення ў ДПНИ патрэбна прынесці вуха таджыка»?

***— Пагроза нацыяналізму ў Расіі пакуль па-за павесткай дня?***

— Мяркую, што як мінімум на выбары ў Думу правы электарат будзе ўпісаны ў прыдуманыя ў Крамлі паліттэхналагічныя схемы. А вось ці спрацуе такая схема на прэзідэнцкіх? Магчыма, давядзецца шукаць новы алгарытм. Таму нельга выключаць, што гэтыя выбары — апошнія для Жырыноўскага.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ВАСІЛЬ ДЖАРТЫ



Старшыня ўраду Крымскай аўтаноміі, на думку палітолагаў, па загаду Януковіча пачаў працэс ліквідацыі аўтаноміі Крыму. Пры гэта сведчыць праект закону «Пра Саўмін Крыму», нядаўна прыняты Вярхоўнай Радай Украіны ў першым чытанні. Праект, які прапанаваў Джарты і які быў падтрыманы 257 дэпутатамі, фактычна выводзіць урад аўтаноміі з сістэмы мясцовых органаў улады, ператвараючы яго ў частку дзяржаўнай выканаўчай вертыкалі. «Сцвярджэнне новых правіл дзейнасці ўрада Крыму можа ператварыць рэспубліку ў звычайную вобласць», — рэзюмуе адна з кіеўскіх газет. Ініцыятыва Партыі рэгіёнаў дастаткова цікавая, паколькі ліквідацыі аўтаноміі Крыму традыцыйна патрабавалі ўкраінскія нацыяналісты, баючыся, што паўвостраў можа стаць плацдармам для расійская экспансіі. Аднак нават у часы кіраўніцтва «аранжавых» замахнуцца на правы паўвострава нацыяналісты не рызыкнулі. Затое гэта зрабіў Януковіч, якім, хутчэй за ўсё, кіруе банальнае жаданне ўзяць пад кантроль крымскую нерухомасць. На думку некаторых журналістаў, на нашых вачах адбываецца рымэйк 1939 года, калі Сталін, які ніколі не меў сентыментаў да ўкраінцаў, атакаваў Польшчу дзеля прагматычных мэтаў і нявольна стаў аб'яднальнікам украінскіх земляў.

### ЛЮК ФЕРЫ



Выказванні экс-міністра культуры Францыі, сябра партыі сацыялістаў пра выпадак педафіліі ляглі ў аснову новага буйнага скандалу, які стаў лагічным працягам скандалу Дамініка Строс-Кана, арыштаванага ў ЗША за сэксуальныя дамаганні. Усе пачалося пасля сенсацыйнай заявы, зробленай Люкам Феры ў эфіры тэлеканала «Canal Plus». Тады былы міністр заявіў, што адзін з былых міністраў карыстаўся сэксуальнымі паслугамі хлопчыкаў у Марока. Службовец таксама дадаў, што гэту інфармацыю яму паведамілі «ў самых высокіх колах» дзяржавы, маючы на ўвазе прэм'ер-міністра. Па сцвярджэнні Феры, французскага міністра-педафіла нават арыштавала паліцыя Марока, але яму ўдалося захаваць гэты факт у сакрэце і вярнуцца інкогніта ў Францыю. Пры гэтым экс-міністр культуры адмовіўся назваць імя педафіла, спаслаўшыся на адсутнасць доказаў. Тым не менш пракуратура Парыжа ўжо пачала папярэдняе расследаванне гэтай справы. Зараз усе гадаюць, хто з вядомых палітыкаў можа аказацца тым самым педафілам, і як яго выкрыццё паўплывае на шансы кандыдата ад сацыялістаў перамагчы Нікаля Сарказі на прэзідэнцкіх выбарах праз год.

### АЛЯКСАНДР ХЛАПОНІН



Паўнамочны прадстаўнік прэзідэнта Расіі на Паўночным Каўказе ў дадатак да чачэнскай ды інгушскай праблемаў атрымаў новы галаўны боль. Пра жаданне ўтварыць уласную аўтаномію ў складзе Расіі заявілі дэлегаты нагайскага народа. У форуме, які адбыўся ў адным з райцэнтраў Дагестану, удзельнічалі каля 500 чалавек, сярод якіх былі дэлегаты з Дагестана, Чачні, Стаўрапольскага краю і Астраханскай вобласці і г.д. Нагайцы — народ Паўночнага Каўказа (колькасць у РФ, па дадзеных на 2002 год, — 90 тысяч чалавек), цюркамоўныя мусульмане-суніты. Асноўная вобласць рассялення — тэрыторыя Нагайскага стэпу, якая ў 1957 годзе была падзеленая адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі межамі паміж Дагестанам, Чачнёй і Стаўрапольскім краем. Па меркаванні нагайцаў, падзел быў рэпрэсіўнай мерай, якая раз'яднала іх народ: «Мы хочам захаваць сваю этнічную радзіму — Нагайскі стэп — для нашых нашчадкаў», — кажуць дэлегаты. Мяркуючы па ўсяму, спробы стварэння нагайскай адміністратыўнай адзінкі не вітаюцца кіраўніцтвам рэгіёнаў, дзе яны пражываюць. Супраць правядзення форуму выступілі шэраг службоўцаў Дагестану. На іх думку, за нагайскімі нацыяналістамі стаяць прадпрымальніцкія структуры, якія жадаюць хапнуць мясцовыя землі. Між тым, Аляксандр Хлапонін і Крэмль пакуль ніяк не каментуюць ідэю нагайскай аўтаноміі.

ЛЁСЫ

# СВАБОДА ВОЛЬГІ ІПАТАВАЙ

**Не палічыце банальнасцю, але я заўсёды, калі чую выступ Вольгі Іпатавай, чытаю яе вершы, яе гістарычную прозу, разумею (выбачайце несур'ёзны каламбур), што цалкам не разумею, чаму жанчын называюць «слабым полам». Якая моц слова, якая моц духу, якая моц таленту, якая моц жыццялюбства і нескаронасці абставінам! Таму эпітэт «слабы» прапаную памяняць на «лепшы», бо пад такімі сюжэтамі лёсу, што выпалі на яе шляху, здольны не схіліцца далёка не кожны з нас.**

**Аляксандр Тамковіч**



Вольга Іпатава з бацькам



Школьныя гады. 1959 г. На творчым семінары — з Янкам Маўрам

## Дзіцячыя сюжэты

У маім нараджэнні магічна спляліся тры рэчы — месца, час і абставіны. Навагодняя ноч 1945 года ў Міры. Былыя партызаны з сем'ямі сабраліся ў нашай хаце, але гаспадыні Марыі няма — яна ў шпіталі, раджае. Шпіталь непадалёку і ад хаты, і ад Мірскага замку. У 00.15 медсястра прыбягае са шпіталю, каб сказаць бацьку, што ў яго нарадзілася дачка. Можа, ён чакаў сына, але радуюцца ўсе, і ўсе п'юць за Новы год, за будучыню, пасля чаго ідуць пад вокны шпіталю, каб павітаць маму. Бацька Міхаіл ідзе з гітарай (у яго быў прыгожы, артыстычны голас), і ўсе падхопліваюць ягоную серэнаду ў гонар жонкі і дачкі...

Муза Гісторыі, безумоўна, была там, як і іншыя феі — добрыя і не вельмі. Над Мірскім замкам, з якога зусім нядаўна, меней за год, з'ехаў апошні ўладальнік, кружыліся сняжынкі, цені мінулага слізгалі ў велічэзныя вакаліцы. Я недзе чытала, што ў нованароджаных энергетычны канал да году як бы адчынены іншым вымярэнням, так што, калі верыць гэтай гіпотэзе, я магла бачыць тое, што адбывалася тут у стагоддзях, — бо іначай адкуль у мяне такая любоў да мінулага і жаданне ведаць пра сваю гісторыю?

Замак увайшоў у мае першыя дзіцячыя ўспаміны. Выломваю з лужыны ля самага ўвахода лядок і смакчу яго, як цукерку, а ружовыя ў вечаровым святле сцены нібы атуляюць мяне, захіляюць ад усяго нядобрага.

Нядобрае ўсё ж прыйшло. Бацька, загадчык Мірскага райфінаддзела, у 1949 годзе атрымаў прызначэнне на тую ж пасаду, але ў Навагрудак. Святкавалі ўжо ў Навагрудку, дзе атрымалі палову шыкоўнага жылога дома з ваннай (непадалёку ад сённяшняй аўтобуснай станцыі). Быў там Башарымаў — ён ехаў у Мір на бацькава месца, бо атрымаў паніжэнне за развод з жонкай Нінай, якая заставалася ў Навагрудку з дзвюма дзяўчынкамі — Светай і Валяй.

Хто мог ведаць, што мяса, якое ўсе дружна елі, не прайшло ветэрынарны агляд? Першай захварэла цяжарная мама. Дактары змаглі паставіць ёй дыягназ толькі ў Мінску, але было позна. 15 снежня мы хавалі яе на могілках у дзвюх хвілінах ад нашага новага жытла і з пахавання пайшлі разам з Башарымавымі ў бальніцу, адкуль я рэгулярна збягала на маміну магілу.

Хаця мне там, у шпіталі, споўнілася пяць гадоў, я нічога з гэтага не памятаю — як адрэзала. Псіхолаг аднойчы сказаў мне, што без гэтага я магла б проста не перажыць усяго, што адбылося.

Праз кароткі час з'явілася мачыха (выхавацелька дзіцячага садка, куды я хадзіла), і я стала ў сям'і лішняй. Неўзабаве мяне «выкінулі» ў Віцебскую вобласць у глухую вёсачку Забелле да бабулі Вольгі.

...Кожны раз, калі ўзгадваю яе, адчуваю бязмерную любоў і шкадаванне. Непісьменная сялянка, яна дала мне Бога ў душы, беларускую мову ў сэрцы, старадаўняе, яшчэ ад паганскіх часоў, адчуванне Вады і Зямлі, народных звычаяў і традыцый.

Памятаю — будзіць мяне, вядзе да стала — памінаць Продкаў на Дзяды. Стаіць куцця, гарыць свечка (электрычнасці яшчэ не было), і яна расказвае мне пра дзеда Якава, што згарэў ад тыфу з дзвюма дачушкамі (маімі цёткамі) за адзін тыдзень у 1933 годзе. Адчыняе дзверы, запрашае за стол усіх — прадзеда Іллю, маю маму, нашых дзядоў і прадзедаў. Мне і страшна, і цікаўна — дзе ж яны?

(Сёння я раблю тое ж і веру — душы нашых продкаў прылятаюць да нашага жытла і дакранаюцца да куцці, якую мы пакідаем ім на стале...)

Альбо стаім на лужку, чуем першы гром. «Ілля на калясніцы неба трасе», — кажа бабуля і прымушае мяне кульнуцца тры разы на тым лужку. І смешна, і гэтак прыемна дыхаць пахам першай маладой травы... Гэта адтуль, з бабуліных павучанняў пра Матухну-Зямлю, склаліся радкі першай паэтычнай кніжкі:

*А зямля так даверліва, проста*
*У сваім харастве паўстае,*
*Што здымаю з ног «шпількі» вострыя:*
*Незнарок не ўкалоць бы яе...*

Потым, праз чатыры гады беднага, але запоўненага любоўю бабулі і дзіцячых радасцей жыцця, зноў вяртанне ў Навагрудак — трэба няньчыць сястрычку, якая нарадзілася. Але — не склалася ў мяне з мачыхай. Не склалася ў яе разуменне і з уласнымі дзецьмі, што ж казаць пра мяне... Не вытрымаўшы, я збегла з гэтай сям'і. Тулялася па лесе, раздумваючы — ці кінуцца ў недалёкую рэчку, ці паехаць да Ніны Башарымавай, якая заўсёды шкадавала мяне і цішком падкармлівала ў галодныя дні.

Жыццё перамагло, Ніна прытуліла мяне на тыя месяцы, якія спатрэбіліся для афармлення дакументаў у Гродзенскі дзіцячы дом. Я катэгарычна адмовілася вяртацца да мачыхі. Бацька то пагражаў мне, то прасіў: «Ты што, хочаш, каб у мяне забралі партыйны білет?» Але сябры адстаялі яго, ён застаўся са сваім партыйным білетам і на сваёй пасадзе.

...Калі ў 1982 годзе ў Магілёве разам з сям'ёй мачыхі мы хавалі яго, я зразумела, як моцна я хацела, каб ён мяне любіў і абараняў. Зразумела, чаму часта не складваліся адносіны з мужчынамі: у маёй душы на многія гады пераплятаўся прага любові, вялікая крыўда і вялікі недавер.

Але зараз я гляджу на яго іначай. Акружэнец, які падчас вайны аказаўся ў Заходняй Беларусі, ён змушаны быў выжываць. І вось жа (зноў магія, ці, як гавораць, збег абставінаў!) прыбіўся ён не куды-небудзь, а да сям'і Янкі Брыля, які на той час быў польскім салдатам у нямецкім палоне. Ёсць у мяне тэлевізійны запіс, дзе народны пісьменнік Янка Брыль расказвае, што, вярнуўшыся з палону ў родную хату, ён убачыў там прыгожага маладога чалавека, які на беларускай мове чытаў «Як гартавалася сталь». Убачыўшы Брыля, устаў, працягнуў руку і вельмі па-хатняму сказаў: «Вот и Ваня вернулся».

Млела там, на Карэліччыне, па ім не адна дзяўчына. Яшчэ ў 2002 годзе, калі я ездзіла на дачу да Янкі Брыля, спыніла мяне жанчына з вёскі, якая абцалавала мяне як родную, прыгаворваючы: «Мішанькіна дачушка, мая ж ты дарагая!» Мне казалі, што яна замуж не выйшла — так яго кахала. Мы спяшаліся, і я паабяцала сабе, што заеду да яе і распытаю, як і што... Не паспела...

Янка Брыль быў бацькавым сябрам да смерці. Разам пайшлі ў партызаны, разам прайшлі вайну. Бацька навучыўся беларускай мове, але так да канца і не мог зразумець, чаму яму, ветэрану, адвялі ў «БелСЭ» адзін радок, а мне, нейкай там паэтцы, цэлы артыкул, хаця і маленькі...

## Гарадскія сюжэты

Дзіцячы дом у Гродна — гэта вялізны пласт уражанняў. Узгадаю першы, з 1956 года: дзетдомаўскія дзеці на той час, калі я прыехала, былі ў вёсцы. Я ехала туды на «палутарцы» з жанчынай, якая нядаўна вярнулася з сібірскіх лагераў і цяпер наведвала дачку Міраславу, з якой мы пасля сталі сяброўкамі на ўсё жыццё. Пані Фэля не была «палітычнай», на яе напісалі данос суседзі, якія занялі яе дамок над Нёманам і жылі там усе восем гадоў, пакуль яна сядзела. Як яна выжывала ў тых лагерах, я даведалася тады ж, у тыя першыя месяцы свайго дзетдомаўскага жыцця, і гэта зрабіла на мяне такое вялізнае ўражанне, што я проста не магла не стаць антыкамуністкай, зразумела, значна пазней. «Круты маршрут» Я. Гінзбург, творы Салжаніцына і Шаламава толькі пашырылі ў маіх вачах маштабы беззаконня і здзекаў з уласнага народа.

Недзе ў шостым класе я пачала складаць вершыкі. Хваліла мяне наша настаўніца рускай мовы, бо школа, зразумела, была руская, як і ўсе школы ў абласных гарадах. Але жыло, не змаўкала ў душы бабуліна беларускае, прыгожае і такое роднае для мяне слова. Таму побач з рускімі вершамі сталі спачатку рэдка, а пасля ўсё часцей з'яўляцца і беларускія.

І ўсё ж першы мой прыз я атрымала на конкурсе газеты «Зорька». Там праходзіў конкурс на лепшы верш аб прыродзе, і Янка Брыль, якому я паслала свае вершыкі, перадаў іх у рэдакцыю. Колькі было гаманы сярод нашых дзетдомаўцаў, калі мне ўручыста ўручалі той прыз — фотаапарат «Змена»!

Пасля сёмага класа дзетдомаўцаў звычайна адпраўлялі ў прафтэхвучылішчы — краіне патрэбна была «рабсіла». Большасць дзяўчат з нашага класа паехалі ў Брэсцкае швейнае вучылішча. Павінны былі паехаць і мы з Мірай, але супраць гэтага рашуча паўстала пані Фэля.

— Я бясплатна працавала на гэтую краіну сем гадоў, так што мая дачка мусіць скончыць дзесяць класаў за дзяржаўны кошт!

Яна хадзіла па інстанцыях і дабілася свайго, стварыўшы прэцэдэнт. Але паколькі дазволілі застацца адной дзяўчынцы, нашыя настаўнікі напісалі ліст з просьбай дазволіць далейшую адукацыю і мне.

Так мы з маёй сяброўкай сталі хадзіць у гродзенскую школу №7.

Гродна — горад, якому я прысвяціла нямала вершаў. Тыя гады ўзгадваюцца мне як чароўныя. Мы ўжо не хадзілі як вайскоўцы, шэрагамі — у сталовую і назад, пад пільным наглядам выхавацелек. Мы былі вольныя — і часам пасля школы ішлі на вуліцу Замкавую, да старажытных замкаў — Старога і Новага, гулялі па вуліцы Ажэшкі і марылі аб універсітэце ў Мінску.

Хачу ўзгадаць пра чалавека, якога я ніколі не бачыла, але які падарыў нам мноства цудоўных гадзін.

На рагу вуліц Ажэшкі і Савецкай быў некалі маленькі кінатэатр, здаецца, «Спартак». Ягоны дырэктар, «дзядзька Сцёпа», сам былы дзетдомавец, распарадзіўся, каб дзеці-сіроты глядзелі фільмы бясплатна. Адна ўмова — садзіцца на свабодныя месцы пасля таго, як згасне святло. Мы з сяброўкай хадзілі туды на кожны новы фільм.

Лаліта Торэс, Міліца Кэр'юс, «Сястра яго дварэцкага», «Сорак першы» — якімі ж шчаслівымі мы вярталіся на свой Тэлеграфны завулак і да паўночы, забраўшыся ў ложак адна да адной, дзяліліся пад коўдрай уражаннямі, замаўкаючы, калі дзяжурная выхавацелька набліжалася да дзвярэй!

...Мае вершы сталі друкавацца ў рэспубліканскім друку, і аднойчы дырэктарка перадала мне тэлефонную просьбу старшыні гродзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксея Карпюка — зайсці да яго.

З таго часу ў маё жыццё ўвайшлі Данута Бічэль і Васіль Быкаў, Ларыса Геніюш і Анатоль Іверс, Міхась Васілёк і, у першую чаргу, сам Аляксей Карпюк.

Я бязмерна люблю іх усіх — кожны з іх даў мне нешта сваё, адметнае, нечаму навучыў, штосьці адкрыў. Данута рэдагавала маю першую кніжку (хаця на вокладцы пазначаны другі рэдактар), і дапісала канцоўку да аднаго верша:

*І сосны глядзяць, стаўшы на цыпкі,*
*Як плешчуцца ў хвалях чырвоныя рыбкі*
***(«Вечар на Нарачы»)***

Праца з ёю была сапраўднымі ўрокамі майстэрства. Сорамна прызнацца, але мая першая кніжка, мабыць, ніколі не выйшла б, каб не Аляксей Карпюк. Гэта ён засадзіў мяне за машынку — друкаваць з нейкіх лісточкаў накрэмзаныя радкі, якія пасля можна было правіць. Я не збіралася быць паэткай — мяне вабіла акторства. Шчасце, што ён высмеяў гэтую ружовую мару ўсіх маладых дурніц.

У шаснаццаць гадоў я паступіла ва ўніверсітэт і стала, разам з Рыгорам Семашкевічам, самай маладой студэнткай. Але жыць на адну стыпендыю было цяжка,

і я на трэцім курсе перайшла на завочнае, а жыць пераехала да цёткі ў Віцебск, бо вярнуцца ў Гродна мне не было куды.

Але нястомны Карпюк «дастаў» мяне і там. Знайшоў мне ў Гродна працу, дапамог прапісацца. Я працавала і завочна заканчвала ўніверсітэт. Пісала дыпломную пра Міхася Васілька, навуковым кіраўніком у мяне быў Сцяпан Александровіч. Тады ж пачала часта ездзіць у Вільню, займацца архівамі заходнебеларускіх выданняў, што дапамагло мне пазней зрабіць шэраг тэлевізійных перадач, якія карысталіся вялікім поспехам, таму што прапагандавалі яны імёны, абсалютна невядомыя для шырокага чытача — паслоў Грамады, паэтаў, што пісалі з-за кратаў, выдаўцоў забароненых кніг...

Як я шкадую, што нічога з гэтага не захавалася! Відэастужак на студыі было няшмат, і сённяшнюю ўнікальную літаратурную перадачу заўтра сціралі падчас запісу якой-небудзь пасяўной. Я запісвала Зоську Верас (у мяне захоўваюцца яе лісты), Антона Луцкевіча, Паўла Крынчыка, прафесара-арабіста Антановіча, сяброў Грамады і ТБШ.

Помню, у вёсцы Труханавічы запісала трох былых актывістаў, якія сядзелі за сваю беларускасць пры паляках, пры немцах, пры Саветах. Старыя людзі прыслалі мне калектыўны ліст падзякі, дзе пісалі, што яны пасля тэлеперадачы ўпершыню адчулі сябе людзьмі і што сельсаветаўскае начальства пачало з імі вітацца...

Забаўны выпадак быў, калі ехала з Мінска з дыпломам, начапіўшы на сукенку ромбік аб вышэйшай адукацыі. Нейкі стары прычапіўся да мяне: маўляў, сапліўка такая, сцягнула ў некага ромбік і красуецца. Як я ні даказвала, што маю вышэйшую адукацыю, ён так і не паверыў ды доўга яшчэ сараміцу мяне галасна, на ўвесь вагон. Я заўсёды выглядала маладзейшай за свае гады, і гэта было прычынай розных забаўных рэчаў. Напрыклад, канадыйскі пісьменнік Кастусь Акула, які скрупулёзна прачытаў мае гістарычныя раманы, аднойчы шчыра сказаў мне: «Ніяк не магу скласці разам твае раманы і цябе! Ну ніяк ты на іх не цягнеш!»



На творчай сустрэчы. Злева ад Вольгі Іпатавай — яе муж Ягор, справа — прафесар Лідзія Савік, аўтар кнігі «Адна між замкаў» (Жыццё і творчасць Вольгі Іпатавай), паміж імі — мастак Мікола Купава



Вольга Іпатава. 2011 г.

## «Няправільныя» сюжэты

...Дык вось, той час у Гродна быў даволі шчаслівы. Першыя ганарары, першая кватэра, замуства, нараджэнне дзіцяці. Ды ў жніўні 1968-га, калі савецкае войска ўвайшло ў Чэхаславакію, у горадзе імгненна зніклі запалкі, соль, крупы. Не было з чаго зварыць кашы майму васьмімесячнаму Руслану. І я каторы раз адчула, што значыць жыць без родзічаў, без аніякай падтрымкі. Да таго ж, пачалі псавацца адносіны з дырэкцыяй студыі тэлебачання, дзе я працавала. Не тыя былі мае героі, уключаючы ансамбль «Лявоны». Пасля іх выступлення «нагарэла» і дырэктару, і рэжысёру Альгісу Дзяргінчысу і, вядома, мне. І за што? За доўгія валасы, за «несавецкі выгляд». Анекдот у тым, што гэта былі будучыя «Песняры», якія зрабіліся візітнай карткай Беларусі, — але пазней, праз колькі там гадоў...

Апроч таго, на мне вісеў і больш цяжкі «грэх»: на рэспубліканскім семінары творчай моладзі ў 1969 годзе, калі стала вядома, што пяцёра «семінарыстаў», у тым ліку і я, атрымаюць граматы ЦК ЛКСМБ, мы вырашылі ад гэтых узнагарод адмовіцца. Якраз тады з універсітэта выгналі «нацыяналістаў» А. Разанава і В. Яраца, пачалася хваля ганенняў на людзей, якія спрабавалі гаварыць аб цяжкім становішчы з беларускай мовай.

Мабыць, такі ўжо быў мой лёс — першай атрымліваць тую злашчасную грамату выклікалі якраз мяне. Было там шмат журналістаў, а таксама і сакратар ЦК ЛКСМБ Анціпаў. Я ўрачыста абвясціла, што адмаўляюся ад гэтай узнагароды ў знак пратэсту супраць русіфікацыі і ганенняў на інтэлігенцыю.

Цяжка апісаць, што там узнялося! Памятаю, як парторг Саюза пісьменнікаў А. Кулакоўскі крычаў, што мяне пагоняць па шпалах назад у Гродна, а другі заўзяты камуніст абвяшчаў, што калі і была такая паэтка Вольга Іпатава, то яе з гэтай хвіліны ўжо няма. Калі галас скончыўся і ад мяне запатрабавалі зараз жа раскаяцца, я адказала, што не яны далі мне нейкія здольнасці, і не ім іх адбіраць, гэта можа зрабіць адзін Бог. Галас узняўся нанова, але я ўжо не слухала...

Усё гэта зрабіла такое ўражанне на чатырох астатніх, што яны пакорліва ўзялі свае граматы-ўзнагароды, якія, пэўна, палілі ім рукі.

Што праўда — усе яны ці то сталі, ці засталіся — беларускімі патрыётамі, добрымі творцамі, а таксама, нягледзячы на ўсё, і маімі сябрамі.

Забягаючы наперад, скажу, што амаль такі ж самы момант быў у мяне 1 лютага 2001 года, калі на Рэспубліканскай нарадзе работнікаў культуры мне, в.а. старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў, далі слова. Я адбівалася ад гэтага «гонару» як магла, бо ведала, што ад мяне, як і ад іншых кіраўнікоў творчых саюзаў, чакаюць лісьлівых просьбаў і падтрымкі дзеючай уладзе. Але — ці то колішні міністр культуры спадзяваўся, што я, хаця і сцяўшы зубы, буду ісці ў агульнай шарэнзе «плакальшчыкаў», ці то больш высокім асобам хацелася пісьменніцкіх «кніксенаў», маё прозвішча паставілі ў ліку выступоўцаў, хаця і перадапошнім.

Не скажу, што маё выступленне было рэвалюцыйным. У пяці хвілінах усяго не скажаш. Але там былі «экспрапрыяцыя нашага пісьменніцкага дома», гаротнае становішча нацыянальнай мовы і нават Машэраў, які хоць колькі ды лічыўся з пісьменнікамі.

Кіраўнік дзяржавы ажно сорак хвілінаў «дзэвуяваў» маё выступленне. Увесь гэты час я сядзела тварам да залі і адчувала позіркі больш за чатырохсот чалавек, скіраваныя на мяне. Ведаючы, што А.Л. не саромеецца ў словах і выразах, я была гатова пры першым жа абразлівым слове ўстаць і з высокай паднятай галавой выйсці з гэтае залі. У думках я праклала маршрут — вось тут спушчуся са сцэны і пайду пасярэдзіне — спакойна, роўна, не азіраючыся... Але тое не спатрэбілася — у яго, А.Л., сапраўды нейкі звярыны «нюх» на такія рэчы. Затое я назірала сапраўдны сеанс Воланда — спачатку не надта прыязная да яго зала, якая ўзарвалася апладысментамі на маё выступленне, паступова «закалыхвалася», успыхвала смешачкамі...

Вяртаючыся да семінара творчай моладзі, узгадваю, як пасля семінара Анціпаў і яго камсамольская каманда паспешліва з'ехалі, не застаўшыся на традыцыйную вячэру з шампанскім. З пісьменнікаў з намі засталіся толькі кіраўнікі семінару І. Шамякін і Я. Брыль. Яны былі трохі разгубленыя. Мяне абкружылі «семінарысты» і амаль сілай павялі на тую вячэру, гаворачы, што гэта прынцыпова, што я павінна там быць.

Пры нейкім пахавальным маўчанні я села, апусціўшы вочы ў талерку. Ніна Шклярава першаю ўзняла келіх з шампанскім і прамовіла: «Давайце вып'ем за Вольгу!»

Паўза. Цішыня. Уздымаецца Янка Брыль і кажа: «Тут за некага быў тост. Дык давайце вып'ем за гэты тост!»

І тут усе загаманілі, павесялелі, і ўсё пайшло сваім шляхам. Толькі Іван Пятровіч з жалем сказаў мне: «Ты сабе зачыніла дарогу ў літаратуру. Ды, можа, мы нешта выправім».

Пасля былі дзве ці тры ідэалагічныя камісіі з Мінску ў Гродна — як гэта яны, пісьменнікі, выгадавалі такога «монстра?» А. Карпюк расказваў, што пра гэты выпадак ён даведаўся ў Мінску, на прыёме ў загадчыка ідэалагічнага аддзела Паўлава. Той «чысціў» А. Карпюка за творы В. Быкава, а пасля дадаў: «А тут яшчэ вашая Іпатава...»

«А што Іпатава? — узгарэўся Аляксей Нічыпаравіч. — Здольная паэтка, цалкам пад маім уплывам...»

Што яму на гэта крычаў раз'ятраны ідэолаг, ён перадаў толькі В. Быкаву — як мужчына мужчыне...

Адным словам, у 1973 годзе (увесь гэты час шлях у рэспубліканскі друк быў для мяне зачынены), я пераехала ў Мінск. А. Кулакоўскі ўшчуваў: «Панаехала вас з правінцыі, ды яшчэ і дысідэнтаў».

Але і Максім Танк, і Іван Шамякін зрабілі ўсё, каб дапамагчы мне і з жыллём, і з працай. Праўда, Леанід Прокша, галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва», толькі праз гады сказаў мне: «Дарагое маё дзіця, каб ты ведала, як мне за цябе дасталася!» — і паказаў рукой уверх, што азначала больш высокае, чым у СБП, начальства — мабыць, ЦК.

...Усё гэта дапамагло мне пазней выстойваць у куды больш суровыя часы, калі ўлада гвалтоўна адабрала ў пісьменнікаў Дом літаратараў і паліклініку і спрабавала ўсяляк задушыць наш творчы Саюз.

Мінск надаў мне «другое дыханне.» 1970-я гады — аспірантура Літаратурнага Інстытута ў Маскве, кніжкі, якія я пісала як апантаная, творчасць, якая прымушала забывацца на ўсё... Было і яшчэ адно ганенне — калі «гісторык №1» Л. Абэцадарскі надрукаваў у «Советской Белоруссии» разгромны артыкул на маю аповесць «Прадыслава» пра Ефрасінню Полацкую, а абласныя і мноства раённых газет падхапілі гэтае цкаванне. Але яно прайшло для мяне амаль непрыкметна, бо мноства лістоў ад розных людзей дапамагло мне асэнсаваць, наколькі ўсё, што тычылася нашай гісторыі, важна для грамадства. Таму з дваццаці сямі маіх кніг самыя дарагія дзве — «Прадыслава» і «За морам Хвалынскім».

## Нечаканыя сюжэты

...Пра падзеі апошняга дзесяцігоддзя трэба пісаць асобна. Калі ў 1998 годзе я прыйшла ў Саюз пісьменнікаў працаваць намесніцай старшыні Саюза пісьменнікаў Уладзіміра Някляева, я і падумаць не магла, якімі драматычнымі стануць для мяне наступныя чатыры гады.

Нечаканыя ўцёкі кіраўніка саюзу ў Польшчу, пра якія я даведалася з радыё «Свабода», штодзённая барацьба за выжыванне творчай арганізацыі, нечарговы з'езд, на якім мяне выбралі старшынёй саюза, ліст В. Быкава з падтрымкай маёй кандыдатуры, аспрэчванне гэтага ліста і паўторная падтрымка Васіля Уладзіміравіча, перададзеная праз А. Мальдзіса... Непрыняцце дэмакратычнага курсу Саюза пісьменнікаў усімі маімі трыма намеснікамі і гвалтоўнае адабранне ў нас усіх выданняў, заснавальнікамі якіх мы былі... Таямнічае выкраданне з сейфа дакументаў XIII з'езда і бездапаможнасць міліцыі.... Эканамічная блакада СБП і подлая хлусня стукачоў... І зараз усё ўва мне пачынае вібрыраваць, калі ўзгадваю тыя дні. Праўда, былі і нечаканыя «радасці». Моцна нас тады даставаў Ціцянкоў і ягонае ведамства, якое патрабавала ў нас аплаты(!) за нашы пакоі ў нашым жа ўласным Доме Літаратара. Для мяне гэты гарылападобны прыслужнік быў асабліва ненавісны: уся Беларусь бачыла, з якой асалодай ён ірваў наш старажытны сімвал — бел-чырвона-белы сцяг — пасля незаконнага рэферэндуму 1995 года.

Неяк у снежні пасля чарговай атакі я села, абсалютна спустошаная, за стол і ў адчаі прагаварыла: «Каб жа цябе чэрці ад нас вынеслі!» Мабыць, бываюць нейкія прарочыя хвіліны, бо не паспела я прыйсці дадому, як пачула па радыё, што Ціцянкова знялі... Ягоны наступца атакаваў нас ужо не так па-сабачы раз'юшана... Але — атакавалі, душылі, сціскаючы нас у самым надзённым — кантактах з чытачамі, магчымасці выказацца. Думалі, што, стварыўшы свой саюз і паабяцаўшы грошы і выданні, яны перацягнуць найбольш таленавітых, а за імі поўдуць астатнія. Пралічыліся — ніводзін з народных пісьменнікаў, нават І. Шамякін, які заўсёды падтрымліваў уладу, у «той саюз» не пайшоў.

Магу толькі сказаць — праз усе нягоды, праз правакацыі, нянавісць і расчараванні ў людзях, якіх дзесяцігоддзі лічыла сваімі сябрамі, — я, як некалькігадовы кіраўнік Саюза пісьменнікаў, зрабіла ўсё, што магла (і чаго не магла), каб мы, пісьменнікі, як творчая арганізацыя не сталі на калені перад подлай і хлуслівай уладай і захавалі сваю духоўную незалежнасць і магчымасць сказаць тую праўду, без якой чалавечая душаператвараецца ў ліпкае, дрыготкае месіва.

Не магу ўявіць сябе ў гэтым наскора скляпаным саюзе, які вымушаны ўхваляць рэпрэсіі супраць самых сумленных людзей краіны, співаць «асану» там, дзе трэба сказаць рашучае «не!».

Так што — няхай без кніг, без ганарараў, без прызнання ў дзяржаўнай прэсе, у «чорным спіску», з выкіданнем тваіх кніг са школьных праграмаў...

Затое — у ладзе са сваім сумленнем, з душой — боскай іскрай, дадзенай табе як компас у жыццёвым моры. З надзеяй, што твае кнігі, нягледзячы ні на што, яшчэ паслужаць Беларусі.

Ганенні і нягоды праходзяць, яны не вечныя. І зараз я чакаю перамен і, як магу, спрыяю таму, каб яны наступілі. Два гады таму зрабіла тое, пра што марыла доўгія гады, — праехаць па Беларусі і напісаць пра людзей-герояў, людзей нязломнага лёсу, змагароў, магілы якіх яшчэ захаваліся ў нашай краіне. Так з'явілася кніга «Свабода да апошняга дыхання». Гэта — і маё жыццёвае крэда.

МУЗЫЧНЫЯ СУСТРЭЧЫ

# MESSAGES FROM SWEDEN, альбо З БЕЛАРУСІ З ЛЮБОЎЮ…

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Беларусы здагадваліся, што сучасную шведскую культуру і літаратуру можна назваць квінтэсенцыяй еўрапейскага светаадчування, і ў той жа час яна — захавальніца жыватворнай сілы сваіх шматвяковых каранёў.**




Так, здагадваліся, а цяпер у нас з'явілася магчымасць у гэтым упэўніцца: у беларускай сталіцы з поспехам прайшлі дні культуры Швецыі–2011. Ініцыятарам і рухавіком гэтай культурнай акцыі стала Амбасада Швецыі ў Беларусі і яе шэф Стэфан Эрыксан. Гэты чалавек добра вядомы беларусам шчырым стаўленнем да ўмацавання шведска-беларускіх адносін як у галіне культуры, так і ў эканоміцы ды турызме.

Здзівіла беларускіх прыхільнікаў шведскай культуры і разнастайнасць праграмы Дзён. Слухачоў чакаў канцэрт шведскага медыевальнага гурта «Hedningarna», сумесныя выставы і літаратурныя чытанні, а таксама канцэрт камернага хору Святога Юханэса і шмат іншага. Яшчэ адна «нечаканая чаканасць» — прэзэнтацыя беларуска-шведскага музычнага праекта «Чара», якім парадаваў шведскіх і беларускіх слухачоў вядомы спявак Зміцер Вайцюшкевіч. Нагадаю, што прэм'ера гэтага альбома Вайцюшкевіча і яго «WZ-Orkiestra» ўжо прайшла ў Паўднёвым тэатры Стакгольма і мела вялікі розгалас сярод тамтэйшых слухачоў і прыхільнікаў музычнай паэзіі.

Цяпер прадстаўнікі шведскай амбасады запрасілі слухачоў у сталічны Палац ветэранаў, у якім і адбылася прэзэнтацыя праграмы на вершы шведскіх паэтаў Катарыны Фростэнсан, Кенэта Клемэтса, Крыстофера Леандоэра, Барбру Ліндгрэн у перакладах Алеся Разанава, Рыгора Барадуліна, Дзмітрыя Плакса і Алеся Лукавенкава. На дыску гучыць песня і на верш Андрэя Хадановіча. Трэба адзначыць, што для больш дакладнага музычнага пераасэнсавання ўзораў сучаснай шведскай паэзіі Зміцер змяніў склад свайго гурта, запрасіўшы вядомых інструменталістаў — Масуда Талібані, які грае на перкусіі і персідскім датары, а таксама цымбалістку Таццяну Грыцук. Гэтыя музыканты ўнасілі ў ансамблевае гучанне «WZ-Orkiestra» шмат новых і не зусім звыклых фарбаў.

Праграма пачалася песняй на верш Клемэтса ў перакладзе Разанава. Гэта вельмі сімвалічны паэтычны твор, у якім пераплятаюцца элементы шведскага старажытнага фальклору, народных паданняў і казак. У выкананні Зміцера гэтыя радкі набылі своеасаблівую псіхадэлічную афарбоўку, а сам твор з песні ператвараецца ў музычную сюіту паводле сучаснай шведскай паэзіі. Трэба адзначыць і вельмі тонкую працу перакладчыка, які імкнуўся з дапамогай арсеналу роднай мовы асэнсаваць нюансы паэтычных радкоў К. Клемэтса. І хоць спадар амбасадар Эрыксан і выканаўца З. Вайцюшкевіч час ад часу падкрэслівалі своеасаблівую меланхалічнасць і дэпрэсіўнасць шведскай паэзіі, беларускія слухачы добра прымалі сімвалізм і наватарства аўтараў.

На верш «Эльсе» Крыстафера Леандроэру Зміцер Вайцюшкевіч на стварыў даволі рытмічную кампазіцыю выразнай рамантычнай накіраванасці:

*Ты зусім не там, дзе няма цябе*
*нічога няма там, дзе цябе няма.*
*Я нават каву п'ю з твайго позірку...*
*(пераклад Р. Барадуліна)*

Кампазіцыя «Элсе» — сапраўдны хіт даволі роўнага ў музычным плане альбома «Чара».

Кампазіцыю «Ліст» на верш Катарыны Фростэнсан упрыгожыла сола на кларнеце, якое выканаў Зміцер Вайцюшкевіч. А вось філасофская кампазіцыя «Ёсць тунэль», у якой паэтам Крыстоферам Леандоэрам асэнсоўваюцца катэгорыі жыцця і смерці, была ўпрыгожана дуэтам датара Масуда Талібані і гітарнымі партыямі Алега Івановіча. Што ж да вакальных партыяў, то ў песні «Ёсць тунэль» Зміцер Вайцюшкевіч выкарыстаў метад, характэрны для рэпу — чытанне тэксту ў рэчытатыўнай манеры.

Вельмі тонкім падыходам да паэтычнага радка, суадносін іх з музыкай і аранжыроўкамі музыкантамі гурта «WZ-Orkiestra», адрозніваліся і іншыя творы з альбома «Чара». Мо таму беларускія слухачы так цёпла прынялі такія песні, як «Не анёлы і не цені» на верш усё таго ж Крыстофера Леандоэра, «Першая» і «У святле месяца» аўтарства Катарыны Фростэнсан. У гэтых творах аўтарам музыкі і аранжыроўшчыкамі выкарыстаныя разнастайныя элементы: ад джазавых інструментальных імправізацый да рытмаў рамантычнага танга і лёгкіх кабарэтных мелодый, звычных для еўрапейскага слыху. Асабліва цёплыя пачуцці слухачоў выклікала кампазіцыя на верш Кенэта Клемэтса «З кары яе твар», прысвечаная шведскім бабулям. Але радкі песні можна было б смела аднесці і да бабуль беларускіх, якія праз гады пранеслі жыццёвае святло і любоў да сваіх блізкіх. Гэта іх родніць, незалежна ад краіны пражывання! Падчас выкання песні вызначыўся сваёй віртуознасцю Вячаслаў Сяргеенка, які грае на кантрабасе.


Зміцер Вайцюшкевіч


Уладзімір Някляеў і Зміцер Вайцюшкевіч


Стэфан Эрыксан

У альбоме З. Вайцюшкевіча прадстаўлены і песні пра мужчын, як пра шведскіх, так і пра беларускіх. Пра характар і звычкі першых распавядаў паэт Крыстофер Леандоэр, за другіх «трымаў адказ» Андрэй Хадановіч. Разам у іх атрымаўся ў нечым сходны іранічны партрэт сучаснікаў мужчынскага роду. Пры чым шведскія мужчыны «адменна гатуюць і ніколі не змешваюць колеры ў пральнай машыне», а беларускія — і ў нашых умовах застаюцца «чыстым аб'ектам для кахання»...

Другое аддзяленне канцэрта Зміцера Вайцюшкевіча было прысвечана 10-годдзю гурта «WZ-Orkiestra». Для гэтага была выкарыстана креатыўная ідэя — нагадаць слухачам па адной песні з больш чым 15 альбомаў Вайцюшкевіча! Таму слухачы з задавальненнем успаміналі дыскаграфію выканаўцы і шчыра адорвалі іх апладысментамі, калі гучалі кампазіцыі Зміцера і гурта «WZ-Orkiestra» з альбомаў «Балады і песні», песні на вершы У. Караткевіча, Л. Дранько-Майсюка, А. Камоцкага, Р. Барадуліна, У. Маякоўскага і прысутных у зале Г. Бураўкіна і У. Някляева. Дарэчы, Уладзімір Пракопавіч пад шчырыя воплескі слухачоў уручыў Зміцеру памятны знак кампаніі «Гавары праўду!».

Нагадаю, што не так даўно ў Швецыі пабачыў дыск пад назвай «Messages From Belarus», які прадставіў шведскім слухачам лепшыя творы беларускай рок-музыкі. І вось цяпер Зміцер Вайцюшкевіч альбомам «Чара» робіць жэст у адказ — прадстаўляе своеасаблівы Messages From Sweden — знаёміць нашых слухачоў з узорамі шведскай паэзіі па-беларуску. Як зазначыў у прадмове да альбома амбасадар Швецыі ў Беларусі С. Эрыксан: «Зміцер — смелы чалавек у жыцці і ў творчасці, і я рады, што ён узяўся напісаць музыку да вершаў шведскіх паэтаў. На гэтым дыску вы пачуеце новага Вайцюшкевіча...» Гэтыя словы спадара Эрыксана напоўніцу спраўдзіліся падчас прэзентацыі беларуска-шведскага праекту «Чара».

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА: 220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.
Замова № 629

Падпісана да друку 09.06.2011. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.